Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛІСТАПАДА 2016 г. СУБОТА № 219 (28329)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Найлепшыя фільмы «Лістапада»

СТАР. 8



## Як зберагчы электраправады?

СТАР. 11



## Артэфакты з гарышча Дома ўрада

СТАР. 12



Фота БЕЛТА.




# ДОБРЫ ПРАГРЭС, РЭАЛЬНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

### У Беларусі і Турцыі шмат агульных інтарэсаў у пашырэнні супрацоўніцтва

**Першы афіцыйны візіт у Беларусь Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана быў вельмі насычаны знакавымі для ўзаемаадносін дзвюх краін мерапрыемствамі і падкрэсліваў сур'ёзнасць намераў гэтыя ўзаемадносіны ўмацаваць і пашырыць. У складзе турэцкай дэлегацыі ў Мінск прыехалі амаль 200 прадстаўнікоў і кіраўнікоў буйнейшых кампаній гэтай краіны для ўдзелу ў беларуска-турэцкім бізнес-форуме, на які зарэгістравалася каля 300 беларускіх кампаній. «Гэта, відаць, самы буйны форум па колькасці кампаній у гісторыі незалежнай Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка, вітаючы свайго турэцкага калегу.**

Аб перспектывах пашырэння супрацоўніцтва, аб узаемнай зацікаўленасці ў гэтым лідары дзвюх краін гаварылі ўчора і падчас перагавораў у вузкім складзе, якія адбыліся пасля цырымоніі сустрэчы высокага госця ў палацы Незалежнасці, і падчас перамоў у пашыраным складзе, што прайшлі ўжо ўвечары.

Турцыя ў свой час была першай дзяржавай у свеце, якая прызнала незалежную Беларусь. Адносіны згоды і даверу захоўваюцца паміж краінамі і сёння. «У нас практычна няма палітычных рознагалоссяў. У нас адзіны погляд на міжнародны парадак дня. Вельмі добрыя адносіны па дыпламатычных каналах, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Так, гандлёва-эканамічныя адносіны ў нас крыху адстаюць ад нашых асабістых, міждзяржаўных адносін. Але нават у гэтай частцы таксама дынаміка дадатная і існуе добры прагрэс».

З гэтым пагадзіўся і Рэджэп Таіп Эрдаган, выказаўшы ўпэўненасць, што Турцыі і Беларусі за кароткі тэрмін удасца павысіць планку тавараабароту да $1 млрд. Пры гэтым ён звярнуў увагу на той факт, што ў цяперашні час турэцкія інвестыцыі ў Беларусь складаюць вельмі вялікую суму. А з улікам цяперашняга візіту турэцкай дэлегацыі на высокім узроўні дадзеныя паказчыкі павінны істотна ўзрасці.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, намеснік міністра эканомікі:**

*«У кіраўніцтве краіны і грамадстве апошнія гады дасягнуты кансэнсус адносна галоўнай мэты — забеспячэння макраэканамічнай збалансаванасці, і ўсе інстытуты выканаўчай і заканадаўчай улады працуюць у гэтым напрамку. Механізмы, што прымяняюцца Нацыянальным банкам, — рэжым манетарнага таргетавання і плаваючага абменнага курса — разам з іншымі фактарамі далі адчувальныя вынікі ва ўсіх сектарах. У Беларусі другі год запавольваецца інфляцыя, і цяпер можна канстатаваць самыя нізкія тэмпы за апошнія 7 гадоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9433 | ▲ |
| Еўра | 2,1139 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0297 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0758 | ▲ |

# НАСТАЎНІК — У НОВАЙ СІСТЭМЕ КААРДЫНАТ

■ Круглы стол

## Чаму нельга паляцець у космас на старым возе?

**Яшчэ Чэрчыль казаў, што настаўнікі валодаюць уладай, пра якую прэм'ер-міністры могуць толькі марыць. Але сітуацыя змянілася, інтэрнэт па сіле ўздзеяння на маладых людзей істотна пераўзыходзіць магчымасці сучаснага настаўніка. Калі раней першакласнікі задавалі пытанні: «Хто? Дзе? Чаму?», то цяпер пачалі пытацца «А ці праўда, што...?» Як педагогу ў сучасных умовах заваяваць аўтарытэт у дзяцей? Ці змяніліся задачы, якія стаяць перад ім? Ці можна вучыць дзяцей так, як гэта рабілі 30 гадоў таму, хоць савецкая адукацыя і лічылася адной з лепшых у свеце? Усе гэтыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі «круглага стала» ў газеце «Звязда».**

СТАР. 6-7




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДОБРЫ ПРАГРЭС, РЭАЛЬНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тэма інвестыцый і кааперацыі была галоўнай і падчас перагавораў кіраўнікоў дзвюх дзяржаў у пашыраным складзе.

«Думаю, ужо пара сыходзіць ад чыстага гандлю таварамі, перастройвацца на новую, кааперацыйную форму ўзаемадзеяння, якая з'яўляецца найважнейшым механізмам выжывання ў сучасных умовах. У Беларусі і Турцыі ёсць неабходныя для гэтага эканамічны патэнцыял і інструменты», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва прамысловых прадпрыемстваў дзвюх краін у галіне аўтамабіле- і трактарабудавання, вытворчасці аўтакампанентаў. «Неабходна спрыяць стварэнню на тэрыторыі нашых дзяржаў сумесных вытворчасцей складанай тэхнічнай прадукцыі, у тым ліку ў мэтах яе прасоўвання на рынкі трэціх краін», — лічыць беларускі лідар.

Важным, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва ў адукацыйнай і навуковай сферах. Ён запрасіў турэцкіх студэнтаў атрымліваць якасную адукацыю па самых высокіх еўрапейскіх стандартах у Беларусі. Беларускі бок таксама бачыць патэнцыял для развіцця сувязяў з турэцкімі тэхналагічнымі паркамі і цэнтрамі трансферу тэхналогій.



Фота БЕЛТА.

Падчас работы беларуска-турэцкага бізнес-форуму.

Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, інтарэсам абедзвюх краін адпавядае далейшае развіццё ўзаемавыгадных і збалансаваных інвестыцыйных і крэдытна-фінансавых адносін. У Беларусі ўжо маецца шэраг прыкладаў паспяховай дзейнасці турэцкіх інвестараў у сферы будаўніцтва, тэлекамунікацый, лёгкай прамысловасці, вытворчасці будматэрыялаў. «Аднак можна смела сказаць, што на гэтым напрамку ў нас захоўваецца значны незадзейнічаны патэнцыял», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў падумаць пра перспектывы актывізацыі беларуска-турэцкага супрацоўніцтва і ў банкаўскай сферы.

«Турцыя з'яўляецца для нас прыярытэтным партнёрам. Мы вельмі высока цэнім нашу дружбу і нацэлены на прадуктыўнае ўзаемадзеянне па ўсіх напрамках. Хачу запэўніць, што мы будзем надзейным сябрам і вашай апорай тут — у цэнтры Еўропы. Можна сказаць, у эканамічным цэнтры Еўразіі. Калі вам гэта цікава, скарыстайцеся гэтым, і давайце развіваць нашы адносіны настолькі, наколькі мы здольныя гэта зрабіць. А мы можам шмат чаго», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Рэджэп Таіп Эрдаган падкрэсліў, што ён задаволены вынікамі візіту ў Мінск і лічыць эфектыўнымі дасягнутыя дамоўленасці. З самага першага моманту знаходжання на беларускай зямлі турэцкая дэлегацыя адчувала гасціннасць прымаючага боку.

«Турцыя — тая краіна, якая ўклала вялікая колькасць капіталу ў Беларусь і гатовая ў далейшым стымуляваць прыход турэцкіх бізнесменаў на беларускі рынак, пашыраць інвестыцыйныя кантакты», — адзначыў Рэджэп Таіп Эрдаган. Турэцкі бок зацікаўлены ў тым, каб стымуляваць інвестыцыйнае ўзаемадзеянне, якое дзякуючы падтрымцы на вышэйшым узроўні павінна развівацца яшчэ больш паскоранымі тэмпамі.

Па выніках афіцыйных перамоў у Мінску Прэзідэнты Беларусі і Турцыі падпісалі сумеснае камюніке, у якім выказаліся за пашырэнне і паглыбленне двухбаковых сувязяў па шэрагу прыярытэтных напрамкаў. Таксама бакамі быў падпісаны пакет дакументаў аб супрацоўніцтве ў розных сферах.

Учора кіраўнікі дзвюх дзяржаў таксама прынялі ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця Саборнай мячэці ў Мінску. З самага пачатку работы па ўзвядзенні культавага будынка фінансаваліся Лігай ісламскага свету. Завяршыліся яны за кошт турэцкага боку ў адпаведнасці з заключаным у 2015 годзе дагаворам паміж Упраўленнем па справах рэлігіі Турцыі і генпадрадчыкам турэцкай кампаніяй «Айсспрынт».

На цырымоніі адкрыцця Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адкрыццё Саборнай мячэці ў сталіцы Беларусі — гэта, безумоўна, знакавая падзея як для мусульманскай абшчыны краіны, так і для ўсіх грамадзян рэспублікі. «Беларусь — краіна з міралюбным характарам. Мы цэнім мір і спакой, таму будуем храмы для ўсіх канфесій. Мы прытрымліваемся аднаго лозунга: любы грамадзянін нашай краіны мае права знайсці сваю дарогу да свайго храма, і ніхто не мае права і не павінен яго прымушаць рабіць інакш», — сказаў Прэзідэнт, выказаўшы ўпэўненасць, што новы храм «стане для мусульман Беларусі і ўсяго беларускага народа важным духоўным цэнтрам, крыніцай асветы і распаўсюджвання гуманістычных ідэй і сапраўдных мэт ісламу».

Учора Прэзідэнты дзвюх краін таксама прынялі ўдзел у адкрыцці беларуска-турэцкага бізнес-форуму. На ім працуюць каля 500 беларускіх і турэцкіх бізнесменаў, якія прадстаўляюць розныя сферы народнай гаспадаркі дзвюх краін. У час форуму праходзіць выстава навукова-тэхнічных дасягненняў Беларусі, на якой прадстаўлена каля 150 інавацыйных распрацовак.

**Паводле БЕЛТА.**

---

■ Адзіны стандарт

# «ЭЛЕКТРОННАЯ ШКОЛА» ПА ЛІЦЭНЗІІ

**Міністэрства адукацыі і кампанія Microsoft Беларусь заключылі мемарандум аб супрацоўніцтве — адзіную дамоўленасць на падпіску ў рамках праграмы ліцэнзавання EES (Enrollment for Education Solutions). Згодна з дакументам, установы дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійнай і вышэйшай адукацыі, а таксама дзяржаўныя органы кіравання атрымаюць доступ да ўсіх неабходных сэрвісаў, праграм і прадуктаў, якія дазваляюць укараніць электронны дакументаабарот і падключыцца да праекта «Электронная школа».**

Важна, што супрацоўніцтва па праграме EES дасць магчымасць установам адукацыі ліцэнзаваць праграмнае забеспячэнне для ўсёй арганізацыі, зыходзячы з колькасці штатных супрацоўнікаў, а не камп'ютараў. Кожны работнік установы адукацыі зможа ўстанавіць пакет Office 365 на пяць мабільных і столькі ж стацыянарных апаратаў, аналагічная магчымасць прадугледжана і для навучэнцаў. Гэта значыць, што настаўнікі, а таксама бацькі, дзеці якіх вучацца ва ўстановах адукацыі, што набылі такую ліцэнзію, змогуць абсалютна легальна і бясплатна карыстацца ўсім праграмным забеспячэннем на ўласных персанальных камп'ютарах і тэлефонах.




Злева направа: кіраўнік прадстаўніцтва Microsoft Беларусь Антон МЯКІШАЎ і міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ падчас падпісання мемарандума.

— З кампаніяй Microsoft мы паспяхова працавалі і раней, а гэты дакумент толькі працягвае практыку на новым узроўні, — сказаў падчас падпісання мемарандума **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Мы не толькі дамаўляемся аб набыцці ліцэнзійнага праграмнага забеспячэння, але і рухаемся ў кірунку агульнай электроннай сістэмы адукацыі: дакументаабароту, «электроннай школы», стварэння адзінага электроннага кантэнту для школ і ВНУ. Хочацца падкрэсліць, што мы не будзем навязваць камусьці, у прыватнасці, універсітэтам, карыстанне толькі гэтай прадукцыяй — усе ўстановы адукацыі маюць права карыстацца самым розным «софтам», але на афіцыйным узроўні за стандарт трэба лічыць менавіта прадукты Microsoft.

На асноўныя прадукты для ВНУ прадугледжана зніжка ў памеры 45 працэнтаў, для школ — 70 працэнтаў. Сумарна зніжкі на асобныя прадукты дасягаюць 95 працэнтаў ад камерцыйнай цаны.

Як патлумачыў **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ**, кожная ўстанова будзе самастойна прымаць рашэнне аб мэтазгоднасці набыцця адпаведных пакетаў праграм у залежнасці ад сваіх задач. Але да пэўнага часу ўся сістэма адукацыі краіны павінна прыйсці да агульнага меркавання ў выкарыстанні праграмнага забеспячэння.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

---

■ Прыярытэты ў навуцы

# АД БІЯКАМП'ЮТАРАЎ — ДА ВЫРАТАВАННЯ ДУБРОЎ І ЛЯСОЎ

**Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, адукацыі і падрыхтоўкі навуковых кадраў заключана паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам.**

**Рэктар БДТУ, доктар тэхнічных навук Ігар ВОЙТАЎ** упэўнены, што супрацоўніцтва дазволіць аб'яднаць практыка-арыентаваны змест адукацыі, характэрны для ўніверсітэта інжынерна-тэхналагічнага профілю, з фундаментальнай навукай. Універсітэту ёсць што прапанаваць акадэміі. У цяперашні час па даручэнні ўрада вядзецца работа па стварэнні на базе БДТУ тэхналагічнага кластара, які аб'ядне ўсе тэхналагічныя ўніверсітэты Беларусі, што дасць значны сінергетычны эфект па распрацоўцы найноўшых тэхналогій.

Ужо сёння навукова-тэхнічны ўзровень структурных падраздзяленняў БДТУ дае магчымасць вырашаць складаныя тэхнічныя задачы. А з аб'яднаннем намаганняў вучоных Акадэміі і ўніверсітэта можна будзе разлічваць на распрацоўку прарыўных тэхналогій у многіх тэхналагічных сферах (лесахіміі, нафтахіміі, біятэхналогіях, фармацэўтыцы, будаўнічых, кампазітных матэрыялах, перапрацоўцы прамысловых і бытавых адходаў і шэрагу іншых).

**Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ** падкрэсліў, што задачы акадэміі і БДТУ на перспектыву супадаюць, а па шэрагу напрамкаў універсітэт займае лідзіруючыя пазіцыі. Ён агучыў шэраг надзённых навуковых праблем на нацыянальным узроўні, якія маглі б сумесна вырашаць акадэмія і БДТУ. Гэта, па-першае, праблемы лесу. Неабходна заняцца аднаўленнем іглічных лясоў, якія адсоўваюцца на поўнач, і знакамітых беларускіх дуброў, якіх у цяперашні час амаль не засталося. Вырашыць пытанні барацьбы з лясным інфекцыямі.

Па-другое, застаецца актуальным праблемы нафтахіміі і лесахіміі. У нафтахіміі — гэта глыбокая перапрацоўка нафты, якая забяспечыць і істотнае пашырэнне наменклатуры выпускаемых прадуктаў. У лесахіміі трэба распрацаваць тэхналогіі глыбокай дрэваапрацоўкі з улікам сусветнага вопыту і, перш за ўсё, скандынаўскіх краін.

Па-трэцяе, пытанні біятэхналогіі — распрацоўка біякамп'ютараў, біяробатаў, біяінтэлектуальных сістэм. Па-чацвёртае, найноўшае прымяненне біятэхнічнага сінтэзу ў фармакалогіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

---

■ Грошы

# З КАРТКІ НА КАРТКУ — ІМГНЕННА

**Налета ўладальнікі картак плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ змогуць самастойна ажыццяўляць міжбанкаўскія пераводы грашовых сродкаў з рахунку на рахунак з выкарыстаннем нацыянальнага «пластыку» ў сетцы інтэрнэт.**

Менавіта з 1 лютага 2017 года ў банкаў-удзельнікаў сістэмы БЕЛКАРТ з'явіцца магчымасць падключаць карткі ўнутранай плацежнай сістэмы да існуючых і новых сэрвісаў міжбанкаўскіх пераводаў грашовых сродкаў праз сеціва. А крыху пазней больш за 5 мільёнаў трымальнікаў айчынных картак змогуць адпраўляць грошы сваім блізкім, сябрам і знаёмым у любы час, а таксама атрымліваць сродкі на свой «пластык» ад другіх асоб.

Памер камісіі за такія пераводы і парадак праўдзення падобных аперацый з выкарыстаннем беларускіх картак вызначаецца кожным банкам, які мае сэрвіс пераводаў, самастойна. У прыватнасці, гэтыя сэрвісы цяпер існуюць у трох фінансавых установах краіны: Белгазпрамбанку, БПБ-Ашчадбанку і МТБанку.

Нагадаю, што цяпер перавод грашовых сродкаў з карткі на картку магчыма ажыццявіць толькі ў спецыяльных памяшканнях фінансавых устаноў і буйных гандлёвых цэнтраў, дзе функцыянуюць інфакіёскі. Больш таго, сёння за такі перавод праз «пластык» банкі бяруць абавязковую камісію, якую часам цяжка назваць сімвалічнай. Такая камісія за паслугу бывае даволі сур'ёзнай, калі ў аперацыі па пераводзе ўдзельнічаюць карткі розных банкаў. Нам застаецца толькі спадзявацца, што плацежная сістэма БЕЛКАРТ паспрыяе стварэнню больш лаяльных умоў для кліентаў розных камерцыйных банкаў, калі апошнія выкарыстоўваюць карткі нацыянальнай сістэмы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Добрая нагода

# «СУЧАСНЫ МІЛІЦЫЯНЕР — МАДЭРНІЗАВАНЫ ДЗЯДЗЬКА СЦЁПА»

## Галоўнай міліцэйскай газеце — 85

**Першы нумар газеты, якая тады называлася «На варце кастрычніка», выйшаў у свет 12 лістапада 1931 года. Асноўная мэта — «павышэнне ўзроўню ідэйна-палітычнай, выхаваўчай і арганізатарскай работы ў асяроддзі ахоўнікаў правапарадку». Выпуск быў прымеркаваны да 14-й гадавіны стварэння Рабоча-Сялянскай міліцыі. Яго падрыхтоўкай займаўся палітаддзел Галоўнага ўпраўлення міліцыі БССР. Газета выйшла на чатырох старонках тыражом у паўтары тысячы асобнікаў. Мы прасачылі шлях і трансфармацыі выдання на працягу 85 гадоў.**

Практычна не захаваліся нумары, якія выходзілі ў даваенны перыяд: у Нацыянальнай бібліятэцы прадстаўлены адзінкавыя асобнікі. А вось азнаёміцца з падшыўкамі за ўсе гады пасля 1945-га можна без праблем. Многія з тэм, якія асвятляліся тады, актуальныя і дагэтуль, ключавое адрозненне ў тым, што ў той час акцэнт рабіўся на дысцыпліну асабістага складу. У 1960-х пачаўся перыяд сапраўднага росквіту выдання. Пашырылася тэматыка публікацый, прыкметна ўзрос літаратурны ўзровень выдання. На яго старонках з'яўляліся матэрыялы такіх вядомых публіцыстаў, як Аляксандр Градзюшка, Міхаіл Фашчылін, Барыс Фралоў, Іван Шпадарук, Анатоль Сівец. Менавіта тут паспрабаваў сябе ў прафесіі цяперашні рэдактар «Советской Белоруссии» Павел Якубовіч. У той перыяд тыраж ведамаснага выдання вырас да 40—60 тысяч, яно выходзіла двойчы на тыдзень.

У 1970-х з-за пастановы ЦК КПСС, якая пакінула на ўсю краіну ўсяго два міліцэйскія выданні, газета часова перастала выходзіць. Пасля аднаўлення маштаб ахопу дасягнуў яшчэ большых размахаў, газета выходзіла тры разы на тыдзень, тыраж часам даходзіў да 480 тысяч асобнікаў. З'явіліся розныя дадаткі, у іх ліку «Пажар», кніжная бібліятэчка «Сышчык».

Цяпер газета выходзіць на 24 палосах кожны тыдзень. Напярэдадні свята мы пагутарылі з **галоўным рэдактарам газеты Наталляй ГАРЫНАЙ.**

***— Наталля Сяргееўна, якія тэмы на парадку дня?***

— У цэлым, сутнасць зместу выдання за 85 гадоў істотна не змянілася. Пытанні барацьбы са злачыннасцю і гарантавання грамадскай бяспекі будуць актуальныя заўсёды. Мы адлюстроўваем дзейнасць усіх службаў. Аднак паколькі бліжэй за ўсё да народу ўчастковыя інспектары, інфармацыя аб іх рабоце заўсёды ў «топе». Пастаянна на слыху і тэма бяспекі на дарогах. Рэаліі сучаснага жыцця звяртаюць увагу на такія праблемы, як наркагандаль, кіберзлачыннасць, працоўнае рабства.

***— Супрацоўнік МУС — патрабавальны чытач?***

— Шчыра скажу, вельмі. Любыя змены ў заканадаўстве, інавацыйныя ідэі, вопыт калег выклікаюць у яго жывую цікавасць. Так што аператыўнасць, як і ў дзейнасці міліцыі, — адна з найважнейшых характарыстык нашай работы.

Сучасны міліцыянер — гэтакі мадэрнізаваны Дзядзька Сцёпа. Дасведчаны, сумленны, спагадлівы, які пры гэтым актыўна выкарыстоўвае новыя тэхналогіі. Нам неабходна адпавядаць!

***— У чым спецыфіка работы з людзьмі ў форме?***

— Я вырасла ў міліцэйскай сям'і, так што з гэтай сферай знаёмая з самага дзяцінства. Паколькі ўсе супрацоўнікі МУС працуюць з людзьмі, яны лёгка ідуць на кантакт, валодаюць навыкамі публічных выступленняў. Калі нейкія моманты не раскрываюцца, то гэта робіцца выключна ў інтарэсах следства. А так пра сваю работу, асабліва пра станоўчыя вынікі, яны расказваюць з задавальненнем. Вельмі любяць з намі супрацоўнічаць ветэраны міліцэйскай службы. З прычыны выхаду тэрміну даўнасці ў сваіх успамінах яны могуць дазволіць сабе быць больш адкрытымі.


СЛУЖЫМ ЗАКОНУ, НАРОДУ, АЙЧЫНЕ!

На страже

стр. 2, 4 Объединённая коллегия МВД состоится в Бресте

стр. 6 - 7

РЕГИОН: стр. 11 - 14

В память о героях необъявленной войны

Прэзідэнт краіны ўручыў высокія дзяржаўныя ўзнагароды

***— З якім вынікам газета прыйшла да 85-гадовага юбілею?***

— Тыраж нашага выдання складае больш за 55 тысяч асобнікаў. Мы сочым за тэндэнцыямі ў паліграфічнай справе, стараемся рабіць актуальную вёрстку, цалкам перайшлі на каляровы друк. У кожным нумары ёсць тэматычны ўкладыш, прысвечаны дзейнасці асобнай службы, а таксама міліцыі ў цэлым у пэўным рэгіёне. Раз у месяц выходзяць рубрыкі аб дзейнасці ДАІ «Дарогам — парадак» і Дэпартамента аховы «Пад знакам савы».

Сярод нашых чытачоў не толькі супрацоўнікі МУС, але і члены іх сем'яў і нават далёкія ад гэтай сферы грамадзянскія людзі. Мы падымаем пытанні, якія могуць быць цікавыя жанчынам, робім спецыяльныя старонкі для дзяцей, ахопліваем культурна-пазнавальную тэматыку.

Газета выходзіць у друкаваным выглядзе, толькі самыя цікавыя публікацыі з'яўляюцца на сайце МУС. І пакуль мяняць фармат мы не збіраемся. Наша газета выконвае не толькі забаўляльную функцыю, у ёй змяшчаецца шмат матэрыялаў, якія можна захаваць і выкарыстоўваць у працы.

**Звяздоўцы віншуюць калектыў газеты «На страже» з юбілеем. Шчыра зычым натхнення, удачы і далейшых поспехаў!**

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by* ■

# КВЕТКІ І СОНЦА З ТАДЖЫКІСТАНА

**Святочным канцэртам у Беларускай дзяржаўнай філармоніі адкрыліся Дні культуры Таджыкістана ў Беларусі.**

Падзея далёка не будзённая. У Беларусі і Таджыкістана наладжаны выдатныя, вобразна кажучы, добрасуседскія адносіны. Адлегласці не становяцца перашкодай у развіцці знешнепалітычных і эканамічных стасункаў. І тым болей тысячы кіламетраў не аддзяляюць, а толькі высвечваюць, падкрэсліваюць еднасць агульнай гуманітарнай прасторы. Пра гэта гаварыў на адкрыцці Дзён братняй краіны міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў. А першы намеснік міністра культуры Таджыкістана Ібадуло Машрабаў назваў многія прыклады культурнага супрацоўніцтва, расказаў, якімі цёплымі былі ў горным краі сустрэчы з легендарнымі «Песнярамі» ды іншымі беларускімі артыстамі. Паведаміў пра тое, як шануюць у Таджыкістане беларускую літаратуру, беларускую драматургію. Назваў імёны Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Танка, Васіля Быкава, якіх добра ведаюць чытачы горнай краіны. Уражлівай падаецца ўвага да драматургічнай творчасці Аляксея Дударава, чые спектаклі ідуць на сцэнах тэатраў Таджыкістана ўжо болей як чатыры дзесяцігоддзі. Намеснік міністра культуры заўважыў, што добрыя стасункі ладзяцца і паміж сучаснымі паэтамі, празаікамі нашых краін. Выходзяць кнігі — як у перакладзе з беларускай на таджыкскую, так і ў перакладзе з таджыкскай на беларускую. Падзеяй стала выданне ў Мінску кнігі «Подзвіг Эмамалі Рахмона».

І беларускі міністр, і госць з Таджыкістана гаварылі, што ў многім добрыя творчыя сувязі ладзяцца па прычыне асаблівай руплівасці Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Таджыкістан у Беларусі Казідаўлата Каімдодава.

Гледачоў, гасцей адкрыцця Дзён культуры Таджыкістана ўразіла выканальніцкае майстэрства, праявы высокіх талентаў танцораў, музыкантаў, спевакоў з узгор'яў Паміра, сапраўды ўнікальных нашчадкаў Рудакі, Мірзо Турсунзадэ. Святочныя мерапрыемствы, якія ладзяцца ў розных гарадах і на розных пляцоўках, працягваюцца.

**Сяргей ШЫЧКО.**


Фота БЕЛТА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## «МІНСК» СУСТРЭЎ ТРОХМІЛЬЁННАГА ПАСАЖЫРА

**Упершыню ў гісторыі грамадзянскай авіяцыі краіны Нацыянальны аэрапорт «Мінск» сустрэў свайго трохмільённага пасажыра. «Юбілейнай» аказалася пасажырка, якая прыляцела авіярэйсам з Санкт-Пецярбурга.**

Да такога выніку аэрапорт ішоў упэўнена апошнія некалькі гадоў. На гэтую лічбу ўказалі на прадпрыемстве вераснёўскія паказчыкі пасажырапатоку. У цэлым жа прырост па абслугоўванні пасажыраў у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» за дзевяць месяцаў года склаў 26,8 працэнта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## НАРАДЗІЎСЯ Ў КАШУЛІ

**Напэўна, так яно і было, бо шанцаў самастойна выйсці з палаючага дома ў яго не мелася ніякіх. Камандзіра аддзялення пажарнай часці №2 Ягора Зайцава можна лічыць хросным бацькам гэтага чалавека.**



Калі бабруйскія ратавальнікі прыбылі на сігнал аб пажары ў адным з прыватных дамоў на вуліцы Арджанікідзэ, суседзі адразу ж іх праінфармавалі, што ў доме нікога няма, бо гаспадар у бальніцы. На вуліцы ўжо было цёмна, але пры аглядзе дома Ягор Зайцаў звярнуў увагу на разбітую шыбу ў акне. Раптам ён убачыў акрываўленыя чалавечыя пальцы, якія ўчапіліся ў падаконнік. Ягор ускочыў на падмурак, з дапамогай спецыяльнай пажарнай сякеркі разбіў акно і заглянуў унутр. Прама пад акном знаходзілася нерухомае цела чалавека, які асеў на падлогу. Ратавальнік схапіў яго, выцягнуў на вуліцу і, узваліўшы на плечы, панёс далей ад небяспечнага месца. Прыкладна праз хвіліну медыкі аказвалі пацярпеламу першую дапамогу. Мужчына знаходзіўся ў непрытомнасці, бо моцна надыхаўся прадуктамі гарэння. Цяпер яго жыццю нічога не пагражае. Засталося высветліць прычыну пажару і як гэты чалавек трапіў у чужы дом.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## А ЯКАЯ ВАША «СТРАВА ТЫДНЯ» З БЕЛАРУСКАЙ КУХНІ?

**З мэтай папулярызацыі нацыянальнай кухні не толькі ў аб'ектах прыдарожнага сэрвісу, але і ў агульнадаступнай сетцы прадпрыемстваў грамадскага харчавання Белкаапсаюз распрацаваў тыпавое меню з беларускіх страў.**

У ім прадстаўлены мачанка з блінамі, дранікі са смажанай свінінай у гаршчэчках, грыбная поліўка, крупнік, бацвінне, блінчыкі з яблыкамі і тварагом і іншыя. Штотыдзень Белкаапсаюз праводзіць акцыю «Страва тыдня» ў сетцы рэстаранаў спажывецкай кааперацыі па ўсёй краіне. Напрыклад, па 14 лістапада ахвотныя могуць пакаштаваць грыбную мачанку. З 15 па 21 лістапада ў меню — біфштэкс «Смак» з бульбай «Радзівілаўскай» і салёным агуркам. Кошт «Страў тыдня» — ад 2,19 да 2,49 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## З'ЕЛІ МЯСА ДЗІКА — ТРАПІЛІ Ў БАЛЬНІЦУ

**У Баранавіцкім раёне зафіксаваная ўспышка інфекцыйнай хваробы, мяркуецца, што гэта трыхінелёз. Людзі сталі паступаць у адпаведнае аддзяленне гарадской бальніцы адзін за адным на працягу некалькіх дзён. Зараз у інфекцыйных палатах знаходзіцца каля 30 жыхароў Прыазёрнага і суседніх вёсак.**

Гісторыя пачалася ў верасні, калі жыхар названай вёскі падбіў дзіка. З мяса жывёлы зрабілі каўбасу і іншыя стравы ды пачаставалі родзічаў і знаёмых. Усяго мясных страў з трафейнага дзіка паспыталі жыхары пяці вёсак. І вось цяпер яны суседзі па інфекцыйным аддзяленні бальніцы. Сярод пацыентаў ёсць трое дзяцей, самаму малодшаму з іх два гады.

Медыкі не пацвярджаюць канчаткова дыягназ трыхінелёз, бо для правядзення аналізу патрабуецца 14 дзён, хоць клінічная карціна захворвання ўказвае менавіта на гэту інфекцыю.

Тым, як дзік трапіў на стол вяскоўцаў, зацікавіліся супрацоўнікі Баранавіцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету і высветлілі наступнае: пры ўборцы кукурузы вадзіцель птушкафабрыкі «Дружба» смяротна траўмаваў дзіка. Мужчына паклікаў на дапамогу таварыша, разам яны разабралі тушу жывёліны, мяса забралі дадому. А вось праверыць прадукт на прадмет яго прыгоднасці ў ежу не палічылі патрэбным. Астатняе вядома.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## АДДЗЯЛЕННЯМ БАНКА — ІМЁНЫ ЗНАКАМІТЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ

**МТБанк рыхтуе прэзентацыю свайго новага праекта «Нашы імёны».**

У яго рамках 44 аддзяленні банка пераўтворацца ў сучасныя біяграфічныя помнікі. Кожнаму аддзяленню будзе прысвоена імя знакамітага суайчынніка, а наведвальнікі змогуць даведацца цікавыя факты аб яго жыцці і дзейнасці. Праект быў ухвалены і падтрыманы Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. Падчас яго прэзентацыі адбудзецца першы аўтамабільны гарадскі квэст-перформанс: удзельнікаў чакаюць чатыры «сакрэтныя» кропкі і разнастайныя цікавыя заданні. Падкрэсліваецца, што спецыяльных ведаў для ўдзелу ў квэсце не трэба. Першымі ігракамі стануць журналісты, для якіх пасля правядуць брыфінг з аповедам пра мэты праекта «Нашы імёны», яго культурную каштоўнасць і далейшае развіццё. У якасці спікераў выступяць кіраўніцтва праўлення банка, аўтар партрэтаў герояў праекта, а таксама дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

## У КРАМЕ ДАСТАЎ ПРАДМЕТ, ПАДОБНЫ НА ПІСТАЛЕТ

**У сталіцы адбылася спроба разбойнага нападу на адзін з супермаркетаў у Першамайскім раёне. Упраўленнем Следчага камітэта па г. Мінску распачата крымінальная справа.**

Па даных следства, 10 лістапада каля гадзіны ночы неўстаноўлены мужчына, знаходзячыся ў краме, дастаў з кішэні прадмет, падобны на пісталет, і спрабаваў завалодаць грашовымі сродкамі супермаркета на суму не менш 1700 беларускіх рублёў. Аднак па незалежных ад яго акалічнасцях не давёў злачынны намер да канца і збег.

У ходзе работы на месцы здарэння следчымі быў праведзены агляд крамы, дапытаныя сведкі і відавочцы. Сумесна з аператыўнымі супрацоўнікамі ГУУС Мінгарвыканкама былі вывучаныя запісы камер відэаназірання. Прыкметы злачынцы: на выгляд 35—45 гадоў, рост 175—180 сантыметраў, сярэднярга целасклада, быў адзеты ў чорную вязаную шапку, чорную куртку ніжэй пояса з серабрыстай маланкай наўскасяк, на твары былі круглыя сонцаахоўныя акуляры з перламутравым шклом.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ З першых вуснаў

## Толькі без самаўпраўства з прыродай!

### На ўсё трэба мець адпаведны дазвол

**Начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргей НОВІКАЎ правёў прамую тэлефонную лінію, адказаўшы на шэраг пытанняў, якія датычыліся тэмы прыродакарыстання. Прыводзім найбольш цікавыя, на наш погляд, урыўкі з размовы Сяргея Віктаравіча з заяўнікамі.**

***— Я паляўнічы і хацеў бы ўнесці прапанову. Калі цяпер дзіка трэба адстрэльваць, то чаму б яго не зрабіць нежаданым відам і дазволіць здабываць пры кожным законным знаходжанні ў паляўнічых угоддзях?***

***Дзмітрый.***

— Такая перспектыва абмяркоўвалася ў рэспубліканскім штабе па прыняцці экстраных мер па ліквідацыі АЧС (афрыканскай чумы свіней). Але яе не падтрымалі. Ну, уявіце сабе сітуацыю: паляўнічы на зайца або качку сустракае дзіка — страляць у яго шротам проста няправільна, а насіць кулі і карцеч такім паляўнічым забаронена. Дарэчы, з-за адстрэлу дзіка цяпер па натуральных прычынах значна павялічылася колькасць зайца, цецерука, рабчыка і глушца.

***— Тыдзень таму мы з сынам нарыхтоўвалі дровы ў хмызняку на палях цяплічнай гаспадаркі. Дакументаў у нас не было, прызнаю. Па дарозе спынілі інспектары, як я ні прасіла, на наступны дзень выпісалі штраф — каля мільёна старымі. Але ж кусты гэтыя падлягалі высечцы — іх усю сёння там няма! Чаму так строга пакаралі?***

***Людміла Якаўлеўна, Аршанскі раён.***

— Нашы інспектары, як правіла, адпрацоўваюць грубыя парушэнні: вялікія крадзяжы лесу і незаконныя высечкі. Тое, што вы сваю віну ўсведамляеце, гэта добра. Секчы без дакументаў нельга ні ў лесе, ні ў хмызняку. Чаму так строга пакаралі, трэба разабрацца.

***— Каля нашай вёскі вялікае возера перасыхае. Калісьці на гэтым месцы капалі гліну, а потым кар'ер напоўніў вадой за кошт крыніцы. У апошнія гады яе ўзровень моцна ўпаў, усё зацягвае глеем. Мы яго часам чысцім, але самі дапамагчы возеру не ў сілах.***

***вёска Квасевічы, Івацэвіцкі раён.***

— На жаль, узровень грунтовых вод за апошнія тры гады імкліва знізіўся з-за доўгай адсутнасці ападкаў. І гэта па ўсёй краіне. Магчыма, крыніца знікла. Цяпер ужо ўсё роўна сезон непадыходзячы для меліярацыйных работ. Давайце паназіраем: сіноптыкі абяцаюць снежную зіму. А каб рыба ў абмялелым вадаёме пад лёдам не задыхнулася, сячыце лункі і закладвайце чаротам, каб не замярзалі.

***— У мяне ў кватэры жыве сабака. Ён неагрэсіўны, і я адпускаю яго на вуліцу пагуляць. А суседзі звярнуліся ў сельсавет, каб яго застрэлілі.***

***Магілёўская вобласць.***

— Сабаку на вуліцу трэба выводзіць на павадку і ў намордніку, інакш ён будзе лічыцца бяздомным.

***— Падкажыце, куды звярнуцца: нашы суседзі па дачы прыручылі сароку. Самі яны з Мінска — дома трымаюць яе ў клетцы, а на дачы выпускаюць палётаць. Птушка людзей не баіцца і можа сесці проста на спіну. Мяне неяк падрапала — дык я потым доўга лячылася ад алергіі.***

***Стаўбцоўскі раён.***

— На ўтрыманне дзікай жывёлы ў няволі трэба мець дазвол, выдадзены Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Але нават пры яго наяўнасці жывёла не павінна дастаўляць непрыемнасцяў навакольным. Для перакanaучасці было б нядрэнна зафіксаваць тое, пра што вы расказваеце, на фота ці відэа. А затым раю вам звярнуцца да ўчастковага інспектара — ён можа і дазвол праверыць, і ў канфлікце разабрацца.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

rs@zviazda.by

# СУВЕНІР ЗА МАЕ ГРОШЫ. ЛЮБЫ?

## Як выбраць падарунак для замежніка? Адказ на гэтае пытанне наш карэспандэнт шукала ў крамах Гомеля

**Да вас прыязжаюць сваякі ў госці? Да мяне таксама. Як водзіцца, не з пустымі рукамі. І ты адпаведна думаеш, чым іх здзівіць — з улікам іх асабістых інтарэсаў, сваіх фінансавых магчымасцей і абавязкова — нацыянальнага каларыту. Кідаешся ў крамы і раптам разумееш, што выбраць прыемны даступны беларускі падарунак не так ужо і проста. Мне апошнім часам даводзілася сустракаць сваякоў і сяброў з трох розных краін: Расіі, Украіны і Ізраіля. Для іх і шукала сувеніры. Адначасова распытвала іншых знаёмых, што каму можа быць даспадобы.**

### САЛОДКА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

Традыцыйны шлях — у краму, дзе прадаюць цукеркі. Дзве агульнавядомыя маркі беларускіх шакаладных вырабаў здольныя зрабіць жыццё смачным і парадаваць любых замежнікаў. Асаблівае захапленне літаральна ва ўсіх выклікае брусок шакаладу, абгорнуты ў паперу экалагічнага колеру з сургучнай пячаткай вагой 1 кг. Ці хаця б 0,5. Калі не ведаеце, што купляць, — гэты варыянт бяспройгрышны.

Мае маскоўскія сваякі беларускі шакалад самі куплялі па некалькі кілаграмаў — на падарункі ўжо сваім сябрам у сталіцы Расіі. І аддавалі перавагу горкаму, які падыходзіць нават тым, хто занадта пільна сочыць за фігурай.

Ізраільскіх сяброў, якія не былі на сваёй малой радзіме чвэрць стагоддзя, змагла парадаваць, калі набрала з дзясятак відаў розных цукерак «родам з СССР». Закон настальгіі ніхто не адмяняў. Але ж не шакаладам адзіным...

### НАСТАЛЬГІЧНЫЯ КАЛОРЫІ

Пра брэнды трэба замовіць слова. І тут мне сябры дапамагалі. Бо ў іх краінах нашымі харчовымі вырабамі вядомых марак актыўна гандлююць. Нават сала ў Ізраіль прывозяць. Мясцовыя вытворцы не аднойчы расказвалі, што нашу «мяса-малочку» ў Расіі і Украіне нават падраблююць: на сваю лепяць наклейку, што быццам беларуская. Добрая вэнджаная каўбаса будзе ўспрынята з удзячнасцю, хоць і з усмешкай.

Згушчанае малако прывозіла да сяброўкі на Украіну. Кажа, ніколі і нідзе такога смачнага не спрабавала. Да таго ж для яе гэта ўспаміны студэнцкай маладосці, калі ва ўніверсітэцкім інтэрнаце слоік згушчонкі быў ласункам пасля атрымання стыпендыі. Урэшце, пакаленню за 40 такія рэчы нагадваюць пра лепшыя гады жыцця, а значыць, здаюцца больш смачнымі ці прыгожымі.

### СУВЕНІР НА ПАМЯЦЬ ЦІ НА СМЕЦЦЕ?

Магчыма, у сталіцы сітуацыя зусім іншая, а ў нашым паўмільённым абласным Гомелі сувенірных крам, дзе можна знайсці арыгінальныя вырабы мясцовых рамеснікаў, не так ужо і многа. Так што зайшла ва ўсе дзве. На самай справе, крамак, дзе прадаюць усё, што трапна збірае пыл на паліцах, вельмі шмат. Але ж шукала нешта з абавязковым мясцовым каларытам.

У месцы, куды мастакі здаюць свае вырабы, мне прапанавалі вялікі асартымент. Здалося, што абсалютная большасць рэчаў зроблена па прынцыпе: налепім на талерку (званочак, кубак, партманет...) слова «Беларусь», «Гомель» або выяву нейкага вядомага помніка — і гэтага будзе дастаткова. Атрымліваецца адносна танна, але зусім нецікава. Да таго ж самі гэтыя вырабы ўяўляюць часам такі «шырпатрэб», што проста шкада плаціць грошы за тое, што хутка будзе выкінута на смецце.

Сустракаюцца асобныя сапраўды мастацкія рэчы, у тым ліку карціны з гомельскімі славутасцямі, але цэннік на іх скача так раптоўна ўверх, што неяк не суадносіцца з плацёжнай здольнасцю насельніцтва ў маёй сціплай асобе. Ці нешта незразумелае за 10 рублёў, ці зразумелае — за 100 і вышэй. Пасярэдзіне — амаль нічога і няма. Засталося пытанне: дзе збываюць свае цацкі нашы ганчары і «саламяныя» майстры? Выбар з трох керамічных фігурак мяне не задаволіў.



Польскі сувенір.

Сяброўка, якая шмат гадоў запар ездзіць у Італію, звычайна загадзя заказвае нешта знаёмаму рамесніку. Але ж і яна гаворыць, што мастацкай разнастайнасці ў сувенірных крамах не бачыць.

Нават на шматлікіх «дажынках», якія восенню праходзяць у тым ліку па ўсёй Гомельшчыне, не так многа пабачыш аўтараў са сваімі вырабамі. Мінімум тры чвэрці плошчаў на такіх святах звычайна займаюць кітайскія танныя цацкі кіслотных колераў. І дзесьці адзінока ўбаку хаваюцца майстры, чые глекі і вазы зусім не «вырві вока», але такія сапраўдныя, беларускія, прыгожыя. Даволі часта раённыя цэнтры расействаў на агульныя святы прывозяць выставы з дзівоснымі вырабамі, якія... не прадаюцца.

Між тым самі мастакі ўлічваюць агульны попыт і магчымасці спажыўцоў. Таму, напрыклад, у кожнага з іх ёсць зусім танныя кубачкі-званочкі-коцікі, разлічаныя на масавы попыт і невялікая лінейка ваз-імбрыкаў-акарын — на аматара і знаўцу. Аднак гэта некалькі іншая тэма.



Балгарскі сувенір.

### СТАНІК З ВЫШЫВАНКАЙ

Ільняныя вырабы з'яўляюцца яшчэ адным універсальным карысным сувенірам з Беларусі. Іх выбар, у тым ліку з нацыянальнымі ўзорамі, пастаянна папаўняецца, што адназначна радуе. Таму і мае знаёмыя, калі зусім губляліся, што купляць у падарунак, набывалі льняныя ручнікі, сурвэткі і абрусы.

Жаночая бялізна раскручанай беларускай маркі, безумоўна, можа стаць прыемным падарункам. Увогуле, беларускі трыкатаж для замежнікаў азначае «са знакам якасці». Калі дакладна ведаеце параметры і асаблівасці фігуры таго, каму дорыце, купляйце — не памыліцеся. Выбар, асабліва ў фірменных крамах, вялікі. Праўда, у маім выпадку, калі не бачыла сяброўку з Ізраіля чвэрць стагоддзя, рызыкаваць загадзя не стала. З украінскай падбіралі разам — засталася задаволена, у тым ліку і коштам.

Мая ж расійская стрыечная сястра дастаўляла неверагоднае задавальненне нашым прадаўцам. Яна не любіць хадзіць па крамах, таму заходзіла ў адну, дзе вялікі асартымент, і скупляла там на кожнага з сямі сваіх блізкіх сваякоў па пяць адзінак тавару. Плюс на сябе, любімую. Не разглядаючы шво з вывараtu, бо абсалютна ўпэўнена ў якасці беларускага трыкатажу.

Ізраільская сяброўка, дарэчы, таксама набыла некалькі рэчаў — з нацыянальным узорам. Расіяне не вельмі разумеюць захапленне «вышыванкамі», ва Украіне хапае і сваіх, а вось «беларуская» ізраільцяне з задавальненнем успрымаюць такое ўвасабленне нацыянальнай ідэі. Футболку з падобнымі малюнкамі павезла мая сяброўка ў Бельгію — сваяму украінскаму зяцю. Спадзяецца, таксама занастальгіруе. Дарэчы, пры ўсёй папулярнасці трэнда, мне здаецца, выбар тавараў з элементамі «вышыванкі» мог бы быць большым. І не толькі на адзенні.

### ПОСУД ДЛЯ БАБУЛІНАГА СЕРВАНТА

Напрыклад, на посудзе маглі б быць зроблены акуратныя элементы з буслом, валошкай ці сонечным сімвалам... Посуд ва ўсіх краінах свету прапануецца ў якасці ўніверсальнага сувеніра.



Беларускі сувенір.

Самы разнастайны: ад дэкаратыўных талерак да прагматычных кубкаў. Вымусіць замежнага госця купіць нешта шкляна-гліняна-парцалянавае можа толькі нейкая асаблівасць пад назвай «у нас такога няма» — зноў жа, праслаўлены нацыянальны каларыт. У Балгарыі, напрыклад, аздабляюць кераміку арыгінальным нацыянальным крапельным роспісам эмалямі.

Наведванне аддзелаў з посудам у Гомелі выклікала расчараванне. Парцалян мясцовай вытворчасці, магчыма, і якасны па нейкіх спажывецкіх уласцівасцях, але ж яго купляць у падарунак не стала б ніколі. Ні для сябе, ні для сяброў. Форма і афармленне выклікаюць жаданне бегчы ў бок кітайскага. Кажуць, што той можа быць небяспечным, але ж аднязначна куды больш арыгінальны па колеравай гаме і малюнках. А чаму б не зрабіць на тых жа кубках нейкія надпісы па-беларуску? Накшталт: «Смачна есці!» ці «Бывайце здаровы, жывіце багата». А колькі ў беларусаў ёсць цікавых арыгінальных жартоўных прыказак ды прымавак! Чаму б іх не выкарыстаць на такіх ці іншых вырабах?

Далей звярнула ўвагу на шкляны посуд. Адзін з айчынных заводаў прапануе грувасткую каляровую пародыю на савецкі крышталь, які калісьці ганарова стаяў у кожным серванце. Чамусьці мяне асабіста гэта зусім не ўразіла, і таму паглядзела на шкло іншага вядомага прадпрыемства. Там былі фужэры больш вытанчаныя, але і іх дызайн не захапіў нічым, што можа выклікаць пазнавальнасць менавіта беларускай школы мастацкага шкла.

Больш прывабіла іх жа лінейка дэкаратыўных вырабаў. Праўда, атрутныя жоўтыя і аранжавыя колеры знізілі маю зацікаўленасць. І ўсё ж менавіта тут знайшла адзіную зялёную вазу, выкананую ў выглядзе... кашалька. Яна была без беларускай сімволікі, але сапраўды арыгінальная і вытанчаная. Да таго ж, урэшце, з уласцівым гумарам ацэнена ізраільскімі сябрамі.



Егіпецкі сувенір.

### ПАКАВАЦЬ, ЯК ГАТАВАЦЬ

Заставалася выбраную вазу разам з цукеркамі прыгожа запакаваць. Канешне, у паперу з нацыянальным нашым узорам, думалася мне.

— Ха! — сказалі мне ў куточку, дзе заварочваюць хораша і з банцікам, — ніколі не бачылі такой паперы. Выбірайце з таго, што ёсць: бліскучыя кветкі ў шырокім асартыменце.

Успомніла, што на першым паверсе крамы бачыла папяровыя пакеты з надпісам накшталт «Запрашаем у Беларусь». У асартыменце іх было цэлых два. Абодва мне не спадабаліся па афармленні і па аб'ёме не зусім падыходзілі, але ж на іх былі буслы і беларускія ўзоры. Прыйшлося спыніцца ў пошуках, бо час падціскаў.

Цяпер вось думаю: можа, у мяне запыты нейкія занадта завышаныя? Ці з густам нешта не так? Можа, шукала не там дзе трэба? У іншых абласных цэнтрах усё інакш? А ў сталіцы і ўвогуле праблем з выбарам падарунка для замежніка няма?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

***P.S.:*** *У працэсе апытанняў з прыемным здзіўленнем даведалася, што яшчэ ў замежніках карыстаецца папулярнасцю беларуская касметыка. Яны ўпэўнены, што гэтая прадукцыя экалагічная, якасная і пры гэтым танная. Дарэчы, мае сябры з-за мяжы таксама абсалютна давяраюць нашым пластмасавым і гумавым цацкам.*

**Выигрывайте только то, что сами хотите, в новогодней рекламной игре от Простоквашино «Призы без сюрпризов»!**

**Каждый день с 14 ноября 2016 года до 27 ноября 2016 года:**

1. Выбирайте любые призы из списка дня.
2. Списывайте всего по 30 баллов за участие.
3. Участвуйте в ежедневных розыгрышах!

Каждый приз был выбран народным голосованием.
А в финале игры все участники участвуют в розыгрыше суперприза!
Любой приз можно выбирать неограниченное количество раз, повышая свои шансы на победу.
И чем больше вы участвуете – тем шансы выше!

# ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Призы без сюрпризов»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Призы без сюрпризов» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Простоквашино», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Призы без сюрпризов» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191682518 (далее – Организатор). Юридический адрес Организатора: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, пом. 24.

Заинтересованным лицом является Иностранное общество с ограниченной ответственностью «ДанонБел», зарегистрированное 25 июля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191047642; местонахождение: 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 76а, пом. 3, офис 3, УНП 191047642 (далее – Заинтересованное лицо).

**2. Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, а также иностранные граждане и лица без гражданства, достигшие 18 лет, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь (далее – Участник).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и Заинтересованным лицом, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**3. Название Рекламной игры:** «Призы без сюрпризов».

**4. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**5. Дата начала Рекламной игры:** 14 ноября 2016 г.

**6. Дата окончания Рекламной игры:** 10 января 2017 г.

**7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** все продукты ТЗ «Простоквашино».

**8. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере 11 256 (одиннадцать тысяч двести пятьдесят шесть) белорусских рублей 18 копеек в денежных знаках 2009 г., что составляет 112 561 800 (сто двенадцать миллионов пятьсот шестьдесят одна тысяча восемьсот) белорусских рублей в денежных знаках 2000 г.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы.

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры

| № | Наименование приза | Количество | Стоимость с НДС за ед., бел. руб. (ден. знаки 2009 г./ ден. знаки 2000 г.) | ИТОГО стоимость с НДС, бел. руб. (ден. знаки 2009 г./ ден. знаки 2000 г.) | Даты розыгрышей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Набор столовых приборов BergHOFF Straight Matt 1272580 и денежное вознаграждение | 3 | 538,20 / 5 382 000<br>65,66 / 656 600 | 1 614,60 / 16 146 000<br>196,98 / 1 969 800 | Розыгрыш главного приза 28.11.2016 в 15:00 |
| 2 | Блинница Tefal PY604434 и денежное вознаграждение | 2 | 206,10 / 2 061 000<br>16,01 / 160 100 | 412,20 / 4 122 000<br>32,02 / 320 200 | 1 ед. – 18.11.2016; 1 ед. – 26.11.2016 |
| 3 | Блинница Tefal PY604434 и денежное вознаграждение | 3 | 206,10 / 2 061 000<br>16,01 / 160 100 | 618,30 / 6 183 000<br>48,03 / 480 300 | 3 ед. – 24.11.2016 |
| 4 | Пылесос Samsung VC21K5130VB и денежное вознаграждение | 4 | 389,31 / 3 893 100<br>43,40 / 434 000 | 1 557,24 / 15 572 400<br>173,61 / 1 736 100 | По 1 ед. – 17.11.2016; 20.11.2016; 22.11.2016; 27.11.2016 |
| 5 | Мультиварка Redmond RMC-M90 и денежное вознаграждение | 2 | 199,80 / 1 998 000<br>15,07 / 150 700 | 399,60 / 3 996 000<br>30,14 / 301 400 | По 1 ед. – 15.11.2016; 19.11.2016 |
| 6 | Мультиварка Redmond RMC-M90 и денежное вознаграждение | 3 | 199,80 / 1 998 000<br>15,07 / 150 700 | 599,40 / 5 994 000<br>45,21 / 452 100 | 3 ед. – 23.11.2016 |
| 7 | Сертификат 21vek.by номиналом 200 руб. (ден. знаки 2009 г.) / 2 000 000 руб. (ден. знаки 2000 г.) и денежное вознаграждение | 5 | 240 / 2 400 000<br>21,08 / 210 800 | 1 200 / 12 000 000<br>105,40 / 1 054 000 | По 1 ед. – 16.11.2016; 25.11.2016; 3 ед. – 21.11.2016 |
| 8 | Кастрюля BergHOFF Virgo Black 2304617 и денежное вознаграждение | 6 | 107,48 / 1 074 800<br>1,27 / 12 700 | 644,88 / 6 448 800<br>7,62 / 76 200 | По 1 ед. – 17.11.2016; 19.11.2016; 21.11.2016; 23.11.2016; 24.11.2016; 27.11.2016 |
| 9 | Сертификат 21vek.by номиналом 60 руб. (ден. знаки 2009 г.) / 600 000 руб. (ден. знаки 2000 г.) | 9 | 72 / 720 000 | 648 / 6 480 000 | 3 ед. – 22.11.2016; 1 ед. – 15.11.2016; 18.11.2016; 20.11.2016; 24.11.2016; 25.11.2016; 26.11.2016 |
| 10 | Вафельница VES SK-A8 | 2 | 39,48 / 394 800 | 78,96 / 789 600 | По 1 ед. – 16.11.2016; 18.11.2016 |
| 11 | Вафельница Maxwell MW-1571 | 2 | 57,42 / 574 200 | 114,84 / 1 148 400 | По 1 ед. – 20.11.2016; 23.11.2016 |
| 12 | Электрочайник Scarlett SC-1024 белый | 6 | 37,80 / 378 000 | 226,80 / 2 268 000 | По 1 ед. – 15.11.2016; 17.11.2016; 19.11.2016; 22.11.2016; 24.11.2016; 27.11.2016 |
| 13 | Блендер погружной Scarlett SC-HB42M30 черный | 6 | 55,80 / 558 000 | 334,80 / 3 348 000 | По 3 ед. – 20.11.2016; 27.11.2016 |
| 14 | Капельная кофеварка Moulinex Subito Mini FG 151825 | 6 | 62,10 / 621 000 | 372,60 / 3 726 000 | По 1 ед. – 16.11.2016; 18.11.2016; 19.11.2016; 22.11.2016; 25.11.2016; 26.11.2016 |
| 15 | Вафельница FIRST Austria FA-5300 | 2 | 48,90 / 489 000 | 97,80 / 978 000 | По 1 ед. – 25.11.2016; 26.11.2016 |
| 16 | Набор для специй Peterhof PH-12875 | 1 | 26,10 / 261 000 | 26,10 / 261 000 | По 1 ед. – 15.11.2016 |
| 17 | Набор для специй Peterhof PH-12875 | 2 | 26,10 / 261 000 | 52,20 / 522 000 | По 1 ед. – 18.11.2016; 20.11.2016 |
| 18 | Набор для специй Peterhof PH-12786 | 3 | 26,91 / 269 100 | 80,73 / 807 300 | По 1 ед. – 22.11.2016; 25.11.2016; 27.11.2016 |
| 19 | Набор для чая/ кофе Termisil CZ00085A | 5 | 30,78 / 307 800 | 153,90 / 1 539 000 | По 1 ед. – 15.11.2016; 18.11.2016; 21.11.2016; 23.11.2016; 24.11.2016 |
| 20 | Блендер стационарный Maxwell MW-1171 | 6 | 51,76 / 517 600 | 310,56 / 3 105 600 | По 1 ед. – 19.11.2016; 21.11.2016; 27.11.2016; 3 ед. – 25.11.2016 |
| 21 | Блендер стационарный Scarlett SC-4143 White | 2 | 61,20 / 612 000 | 122,40 / 1 224 000 | По 1 ед. – 15.11.2016; 17.11.2016 |
| 22 | Кухонные весы Sinbo SKS-4511 | 2 | 36,13 / 361 300 | 72,26 / 722 600 | По 1 ед. – 21.11.2016; 23.11.2016 |
| 23 | Кухонные весы BergHOFF 2003275 | 4 | 89,70 / 897 000 | 358,80 / 3 588 000 | По 1 ед. – 26.11.2016; 16.11.2016; 2 ед. – 19.11.2016 |
| 24 | Тостер Scarlett SC-TM11002 | 6 | 49,50 / 495 000 | 297 / 2 970 000 | По 1 ед. – 16.11.2016; 17.11.2016; 20.11.2016; 21.11.2016; 23.11.2016; 26.11.2016 |
| 25 | Блендер погружной Scarlett SC-HB42M30 черный | 4 | 55,80 / 558 000 | 223,20 / 2 232 000 | По 1 ед. – 16.11.2016; 17.11.2016; 22.11.2016; 24.11.2016 |
| | **Итого величина призового фонда:** | | | 11 256,18/ 112 561 800 | |

**9. Порядок участия в Рекламной игре**

Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо:

9.1. Зарегистрироваться или быть зарегистрированным на сайте prostokvashino.by с 14 ноября 2016 года по 27 ноября 2016 года. Для регистрации на интернет-сайте необходимо ввести на сайте следующие персональные данные:

– фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно);

– адрес проживания в Республике Беларусь: почтовый индекс (обязательно), область (обязательно), район (обязательно), тип населенного пункта (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии);

– адрес электронной почты (обязательно);

– номер мобильного телефона Участника (обязательно).

После отправки персональных данных Участнику необходимо подтвердить свою регистрацию и согласие с Правилами, перейдя по ссылке в письме, отправленном Организатором Участнику на адрес его электронной почты.

9.2. Накопить не менее 30 баллов в личном кабинете, выполнив любые разрешенные действия согласно правилам сайта, а именно:

9.2.1. Зарегистрировать уникальный 11-значный буквенно-цифровой код, который дает 5 баллов, в личном кабинете пользователя (далее – промокод), размещенный под этикеткой или под крышкой следующих продуктов:

- «Простоквашино» Сметана 15%, 180 г Био;
- «Простоквашино» Сметана 10%, 350 г;
- «Простоквашино» Сметана 15%, 350 г Био;
- «Простоквашино» Сметана 20%, 180 г Био;
- «Простоквашино» Сметана 20%, 350 г Био;
- «Простоквашино» Сметана 25%, 180 г;
- «Простоквашино» Сметана 25%, 350 г;
- «Простоквашино» Сметана 30%, 350 г;
- «Простоквашино» Йогурт 335 г, Клубника 2,2%;
- «Простоквашино» Йогурт 335 г, Черника 2,2%;
- «Простоквашино» Йогурт 335 г, Вишня 2,2%.

9.2.2. Зарегистрировать промокод, размещенный под крышкой следующих продуктов (за каждый код начисляется 5 баллов):

- «Простоквашино» Молоко 0,5%, 950 мл;
- «Простоквашино» Молоко 1,5%, 950 мл;
- «Простоквашино» Молоко 2,5%, 950 мл;
- «Простоквашино» Молоко 3,2%, 950 мл.

9.2.3. Зарегистрировать чек, подтверждающий покупку следующих продуктов в период с 14 ноября 2016 года по 26 ноября 2016 года:

- «Простоквашино» Масло Кисло-сливочное Крестьянское 82%, 180 г = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Масло Сливочное 82,5%, 180 г, Беларусь = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Масло Сливочное 82,5%, 180 г, Беларусь = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Масло Сливочное Крестьянское 72,5%, 180 г, Беларусь = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Сливки 10%, 200 г = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Сливки 20%, 200 г = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Сливки 10%, 350 г = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Сливки 20%, 350 г = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Сырок 40 г, Сгущенка = 2 балла за код;
- «Простоквашино» Сырок 40 г, Ваниль = 2 балла за код;
- «Простоквашино» Молоко Пастеризованное 3,2%, 900 мл = 5 баллов за код;
- «Простоквашино» Молоко Пастеризованное 1,8%, 900 мл = 5 баллов за код;
- Творог «Славянские традиции» с массовой долей жира 5%, ТЗ «Простоквашино» = 5 баллов за код;
- Творог «Славянские традиции» с массовой долей жира 9%, ТЗ «Простоквашино» = 5 баллов за код;
- Творог «Славянские традиции» с массовой долей жира 0%, ТЗ «Простоквашино» = 5 баллов за код.

9.2.4. Осуществить регистрацию на сайте в течение проведения Рекламной игры = 50 баллов.

9.2.5. Добавить рецепт, содержащий молочные продукты, в раздел «Вкусности» в случае, если рецепт добавлен с прикреплением авторских фотографий готового блюда, что подтверждается модератором сайта в течение 48 часов с момента добавления, и пошаговым описанием процесса приготовления блюда = 9 баллов.

9.2.6. Добавить фотографии пошагового процесса приготовления блюда в комментариях к рецепту, размещенному в разделе «Вкусности», = 3 балла.

9.2.7. Активировать коды от молочной продукции «Простоквашино» в следующих сочетаниях:

- активация 2 (двух) кодов от любого ультрапастеризованного молока «Простоквашино» и 2 (двух) кодов от любой сметаны «Простоквашино» в течение 7 (семи) календарных дней = 10 баллов;
- активация 1 (одного) кода от любого ультрапастеризованного молока «Простоквашино» и 3 (трех) кодов от любой сметаны «Простоквашино» в течение 7 (семи) календарных дней = 10 баллов;
- активация 2 (двух) кодов от любого йогурта «Простоквашино» и 2 (двух) кодов от любого ультрапастеризованного молока «Простоквашино» в течение 7 (семи) календарных дней = 10 баллов;
- активация 1 (одного) кода от любого ультрапастеризованного молока «Простоквашино» и 3 (трех) кодов от любого йогурта «Простоквашино» в течение 7 (семи) календарных дней = 10 баллов.

9.2.8. В честь дня рождения Участника, в случае если день рождения Участника выпадает в период проведения Рекламной игры, = 3 балла.

9.2.9. За заказ каждого подарка из онлайн-каталога стоимостью выше 50 баллов = 50 баллов.

К участию в Рекламной игре принимаются в том числе баллы, накопленные на интернет-сайте prostokvashino.by до старта Рекламной игры.

9.3. Выбрать любой приз ежедневного розыгрыша призов, в розыгрыше которого Участник хочет участвовать, на сайте http://prostokvashino.by/igra. Призы можно выбрать на ближайший розыгрыш. Выбор призов становится возможным с 00:00:01 до 23:59:59 текущего дня на розыгрыш следующего дня.

9.4. Нажав на кнопку «Участвовать» под изображением приза, Участник тем самым подтверждает списание 30 баллов со своего счета в личном кабинете.

9.5. Все Участники Рекламной игры, поучаствовавшие в одном и более ежедневных розыгрышах, автоматически становятся Участниками розыгрыша главного приза.

9.6. Уведомление об успешной регистрации с присвоением порядкового номера Участника (1000000, 1000001, 1000002 и т. д., присвоенный согласно времени и дате списания баллов) и дату розыгрыша, в котором участвует данный порядковый номер, Участник получает в диалоговом окне на странице интернет-сайта prostokvashino.by/igra, а также в уведомлениях в личном кабинете в течение 24 часов с момента регистрации участия.

9.7. Один Участник может участвовать в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии наличия достаточного количества баллов в личном кабинете и выполнения данных Правил.

9.8. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участниками при регистрации на сайте prostokvashino.by или/и выборе приза в ежедневном розыгрыше.

**10. Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, порядок определения победителей Рекламной игры**

Розыгрыши призов проводятся по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, дом 16, корп. 4, 2-й этаж, офис 5 в 15:00 с 15 ноября 2016 года по 28 ноября 2016 года.

10.1. Наименование и количество разыгрываемых призов, а также даты розыгрышей каждого приза указаны в п. 8 настоящих Правил.

**10.2. Механика проведения ежедневного розыгрыша призов**

Для проведения каждого розыгрыша Организатор оформляет на каждый порядковый номер Участника карточку, которая содержит только порядковый номер Участника.

Карточки группируются согласно желанию Участника участвовать в розыгрыше того или иного приза. Объявляется разыгрываемый приз. В момент розыгрыша приза карточки Участников помещаются в лототрон, член Комиссии раскручивает лототрон и путем случайного выбора карточки определяет основного победителя.

Таким же образом последовательно выбирается резервный список из 2 (двух) карточек Участников для каждого приза.

Если количество карточек, участвующих в розыгрыше приза, в лототроне менее 3 (трех), то резервный список формируется из карточек, оставшихся после определения основного победителя.

Если ни один из Участников ежедневного розыгрыша призов не выбрал какой-либо из ежедневных призов, то приз считается не разыгранным и переходит в распоряжение Организатора.

**10.3. Механика проведения розыгрыша главного приза**

В розыгрыше главного приза участвуют все порядковые номера, выданные в период с 14 ноября 2016 года по 27 ноября 2016 года.

В момент розыгрыша главного приза карточки Участников, участвующие в розыгрыше главного приза, помещаются в лототрон, член Комиссии раскручивает лототрон и путем случайного выбора карточки определяет победителя.

Таким же образом последовательно выбирается резервный список из 2 (двух) карточек Участников.

10.4. Имена победителей ежедневных розыгрышей и главного приза будут размещены на интернет-сайте Рекламной игры prostokvashino.by/igra на следующий рабочий день после проведения розыгрышей призов.

**11. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения призов**

11.1. Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше посредством отправки письма на адрес электронной почты, указанный при вводе персональных данных на странице регистрации на сайте http://prostokvashino.by, не позднее следующего рабочего дня, следующего за днем розыгрыша.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: SMS-сообщением или звонком по телефону, указанному при вводе персональных данных на сайте.

11.2. Для получения приза победитель Рекламной игры, **проживающий в г. Минске**, должен до 11 декабря 2016 г. явиться по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 16, предварительно связавшись с Организатором по телефону: (+375 44) 765-44-68 (звонок тарифицируется согласно тарифам оператора, услугами которого пользуется Участник). Связаться с Организатором и получить приз можно с понедельника по пятницу с 10:00 до 19:00, в субботу с 10:00 до 12:00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность.

Победитель, **проживающий не в г. Минске,** должен до 11 декабря 2016 г. отправить по адресу электронной почты prostokvashinobel@gmail.com отсканированную копию паспорта (стр. 25, 31–33) – для граждан Республики Беларусь или отсканированную копию вида на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан. После получения вышеуказанных документов Организатор до 25 декабря 2016 г. осуществляет за счет своих средств доставку призов победителям, **проживающим не в г. Минске,** по адресу, указанному при вводе данных на интернет-сайте prostokvashino.by. Призы доставляются только по территории Республики Беларусь.

11.3. В случае если с победителем Рекламной игры не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при вводе на интернет-сайте prostokvashino.by, либо победитель не явился за получением приза согласно п. 11.2 настоящих Правил, либо не предоставил все необходимые данные для получения приза, право на получение приза переходит к победителю из резервного списка, сформированного при розыгрыше призов.

11.4. Победители Рекламной игры из резервного списка извещаются о выигрыше способом, описанным в п. 11.1 настоящих Правил.

**Первый резервный победитель** извещается о выигрыше в течение 2 дней со дня признания его победителем, но не позднее 14 декабря 2016 г.

Для получения приза первый резервный победитель должен до 18 декабря 2016 г. отправить по адресу электронной почты prostokvashinobel@gmail.com отсканированную копию паспорта (стр. 25, 31–33) – для граждан Республики Беларусь или отсканированную копию вида на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан.

**Второй резервный победитель** извещается о выигрыше в течение 2 дней со дня признания его победителем, но не позднее 20 декабря 2016 г.

Для получения приза второй резервный победитель должен до 27 декабря 2016 г. отправить по адресу электронной почты prostokvashinobel@gmail.com отсканированную копию паспорта (стр. 25, 31–33) – для граждан Республики Беларусь или отсканированную копию вида на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан.

После получения вышеуказанных документов Организатор до 10 января 2017 г. осуществляет за счет своих средств доставку призов победителям из резервного списка по адресу, указанному при вводе данных на интернет-сайте prostokvashino.by.

11.5. Организатор не оплачивает победителям Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

11.6. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством призов.

11.7. В случае если призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки либо с победителями не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, призы остаются в распоряжении Организатора.

11.8. Организатор при выдаче призов победителям Рекламной игры признается налоговым агентом и несет ответственность за соблюдение действующего налогового законодательства Республики Беларусь. Выдача призов производится путем передачи приза победителю за минусом суммы денежного вознаграждения в размере возмещения подоходного налога.

11.9. Приз считается переданным победителю с момента подписания победителем Акта приема-передачи приза или с момента передачи приза для доставки нарочной службе.

11.10. В случае если победитель не может получить приз лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении документа, удостоверяющего личность, и нотариально заверенной доверенности.

**12. Комиссия по проведению Рекламной игры**

Для контроля соблюдения официальных Правил Рекламной игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрения спорных случаев, принятия решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель Комиссии – Живоглод Елена Николаевна, коммерческий директор ООО «Пиар куб».

Члены комиссии:

1. Абрамчик Елена Валерьевна, бухгалтер ООО «Пиар квадрат».
2. Кирвель Екатерина Вячеславовна, бухгалтер ООО «Пиар куб».
3. Самуйлова Наталия Валерьевна, руководитель проектов ООО «Пиар квадрат».
4. Климович Марина Вячеславовна, бухгалтер ООО «Пиар куб».

**13. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры**

Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 27 декабря 2016 г. включительно.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на странице Рекламной игры на интернет-сайте prostokvashino.by/igra, а также по телефону горячей линии: (+375 44) 7-222-000 круглосуточно и без выходных дней (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Участник).

**14. Прочие условия**

14.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

14.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель розыгрышей дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

14.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет (например, плохое соединение с провайдером, поломки в сети и т. д.).

14.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с победителями в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

14.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по адресу: РБ, 220030, г. Минск, а/я 171.

Рекламная игра «Призы без сюрпризов».
Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2873, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 9 ноября 2016 г.
Организатор – ООО «Пиар квадрат». УНП 191682518.
Срок проведения рекламной игры – с 14.11.2016 г. по 10.01.2017 г.

# НАСТАЎНІК — У НОВАЙ

**Да дыскусіі мы запрасілі начальніка Цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ, кандыдата педагагічных навук, дацэнта, намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Адукацыя і выхаванне» Аляксандру ПАЗНЯК, загадчыка лабараторыі праблем выхавання асобы Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдата педагагічных навук, дацэнта Анатоля ГЛІНСКАГА, пераможцу Рэспубліканскага конкурсу педагагічнага майстэрства «Настаўнік года — 2011», старшага выкладчыка Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МДЛУ, настаўніка англійскай мовы мінскай гімназіі №24, кіраўніка Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў Рэспублікі Беларусь «Імкненне» Інэсу ЗУБРЫЛІНУ, лаўрэата рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года — 2011», настаўніка біялогіі і хіміі Лугаваслабодскай сярэдняй школы Мінскага раёна Алену ГАРБАР, лаўрэата рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2006», настаўніка біялогіі гімназіі №8 г. Мінска Вольгу ЛАГУНОВУ (усе трое маюць найвышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст» і з'яўляюцца членамі клуба «Хрустальны журавель»), намесніка старшыні Таварыства беларускай школы, кіраўніка інтэрнэт-партала nastaunik.info Тамару МАЦКЕВІЧ, настаўніка гісторыі і грамадазнаўства смаргонскай СШ №5 Ларысу ВАЛЫНЕЦ і заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, педагога-метадыста вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ганну ДАБРЫНЕЎСКУЮ.**



Аляксандра ПАЗНЯК.



Анатоль ГЛІНСКІ.



Інэса ЗУБРЫЛІНА.



Алена ГАРБАР.

## Рэвалюцыйны ці эвалюцыйны шлях?

**«ЗВЯЗДА»:** ***Адукацыйныя рэформы, на жаль, не вельмі папулярныя ў грамадстве. Людзі не заўсёды разумеюць, што ім прапануюць і навошта трэба штосьці змяняць. Натуральна, што такія праблемы не турбуюць міністра аховы здароўя, які не абавязаны тлумачыць публіцы, чаму змяняецца метад апендэктаміі. А мы вымушаны наладжваць камунікацыі з грамадствам, нават калі змяняецца змест падручнікаў для пачатковых класаў. Таму што любыя змены цягнуць грамадскі рэзананс... Прыкладна так сказаў падчас III з'езда настаўнікаў СНД у Мінску міністр адукацыі Арменіі Армен Ашацян. І дабавіў: «Мне незнаёмы ні адзін міністр адукацыі (прычым не толькі ў краінах СНД), які б з'яўляўся папулярным чалавекам у сваёй краіне». Як вы лічыце, кансерватызм нашай школы — гэта яе мінус ці плюс? Увогуле, наколькі хутка школа рэагуе на зменлівы свет? Ці не адстае яна ад патрэб дзяцей?***

**Вольга ЛАГУНОВА:**

— Сістэма адукацыі, лічу, у прынцыпе не можа быць кансерватыўнай, бо ў ёй працуюць жывыя людзі. Мы не можам не змяняцца, бо змяняюцца дзеці, і мы не можам вучыць новае пакаленне па-ранейшаму. Але ці была ў нас рэформа? Мы пачалі пераход да 12-гадовай школы і кінулі, збіраліся пераходзіць на профільнае навучанне, але ў апошні момант адмовіліся ад гэтай ідэі. А цяпер усё распачалі нанова.

**Інэса ЗУБРЫЛІНА:**

— А вам не падаецца, што кансерватызм з'яўляецца часткай нашай свядомасці, нашага стылю жыцця. Мы баімся рэзкіх рухаў, таму робім крок наперад і адступаем трошкі назад, зноў крок наперад — зноў назад... І вельмі здорава, што ёсць людзі, якія з усіх сіл падштурхоўваюць, нават праваруюць змяненні. Часам трэба крытычна паглядзець на ўсё, што мы робім, і я пагаджуся, што аналізу нашых дзеянняў не было. Работу над памылкамі мы не зрабілі. Сёння асноўнымі прынцыпамі адукацыйнай палітыкі павінны стаць развіццё, разнастайнасць і свабода. Калі не заўважаць змен, што адбываюцца вакол нас, то лёгка можна страціць сам статус інстытута адукацыі. Школа павінна стаць адкрытай для новых ідэй, празрыстай для грамадства і, зразумела, для сваіх вучняў.

**Аляксандра ПАЗНЯК:**

— Бацькі, бабулі, дзядулі — гэта не публіка, не староннія назіральнікі, а людзі, якія разам з прафесійнымі педагогамі ўдзельнічаюць у выхаванні і навучанні. І яны маюць права ведаць, што адбываецца ў сістэме адукацыі, як змяняюцца падручнікі, вучэбныя праграмы, якія інавацыі асвойваюцца, якія псіхолага-педагагічныя адкрыцці ўводзяцца ў практыку, а што ўжо «аджыло свой век», таму мы павінны ўсе важныя пытанні выносіць на грамадскае абмеркаванне, каб зрабіць бацькоў нашымі саюзнікамі, прычым саюзнікамі адказнымі.

З вызначэннем «кансерватыўная школа» я асабіста пагадзіцца не магу. Мой дзесяцігадовы вопыт працы ў якасці намесніка галоўнага рэдактара рэспубліканскага часопіса «Адукацыя і выхаванне» дазваляе з упэўненасцю сцвярджаць, што сучасная беларуская школа ў плане і педагагічных тэхналогій, і арганізацыі адукацыйнага асяроддзя вельмі прагрэсіўная і мабільная. Мы пастаянна публікуем матэрыялы, у якіх педагогі і намеснікі дырэктараў па вучэбнай дзейнасці дзеляцца сваім вопытам працы ў рубрыках «Эксперыменты і інавацыі ў адукацыі», «Педагагічная скарбонка» «Партрэт адукацыйнай установы» і іншых. Гэты досвед разнастайны, актуальны і вельмі сучасны.

Штогод Міністэрства адукацыі зацвярджае пералік устаноў адукацыі, на базе якіх адкрываюцца інавацыйныя і эксперыментальныя пляцоўкі па апрабацыі і ўкараненні эфектыўных умоў, тэхналогій, форм і метадаў навучання і выхавання. У гэтым навучальным годзе ў пералік увайшлі аж 940 устаноў адукацыі. Прычым школы канкурыруюць за права стаць такой пляцоўкай.

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Кансерватызм, пра які мы кажам, у фізіцы называецца інерцыяй: яна характэрная для любога аб'екта, што рухаецца, і праяўляецца ў той ці іншай ступені ў залежнасці ад хуткасці руху. У наш час усё імкліва змяняецца — і машыны, і вытворчасць, і людзі, а галоўнае, патрабаванні да школы, настаўнікаў і, у пэўнай ступені, да вучняў. Кансерватызм можа быць праявай асцярожнасці, удумлівасці, асэнсавання, каб выбраць правільны шлях. І калі мы зробім крок назад, каб потым зрабіць два крокі наперад, то гэта добра. Як, напрыклад, зрабілі з профільным навучаннем. Крок назад быў рэзкі, вельмі балючы, але затое сёння зрабілі два крокі наперад. Мы ўсе імкнёмся адпавядаць часу, але наша з вамі задача больш складаная — настаўніку трэба не проста адпавядаць, але ў чымсьці і апярэджваць час, і нават паскараць яго. А вось да гэтай ролі мы яшчэ не дараслі, нават нягледзячы на тое, што наш настаўнік змяніўся і стаў больш мабільны, больш кампетэнтны, больш сучасны, хоць ён і не вельмі ацэнены дзяржавай. Натуральна, што у космас на старым возе не паляціш, патрабуецца карабель — добры, сучасны, які рухаецца з вялікім паскарэннем. Трымаючыся за стары багаж, мы далёка не пойдзем, таму не трэба азірацца ўвесь час назад. Настаўнік сёння — іншы, і ўмовы, у якіх ён працуе, — іншыя. Першы плюс у тым, што настаўнік мае дыдактычную свабоду. Я ведаю, пра што кажу, бо школе прысвяціла 55 гадоў, а ў яе гісторыі былі розныя перыяды. Намнога менш свабоды ў адміністрацыі, а вось у настаўніка больш магчымасцей для выбару. Іншае пытанне, як ён імі карыстаецца? Вымушана канстатаваць, што мы не заўсёды адпавядаем паскарэнню.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Я параўнала б рэформу адукацыі з капітальным, а не касметычным рамонтам у кватэры: калі выносяцца старыя рэчы, замяняецца падлога, устанаўліваецца пасудамыйка, робіцца ўсё для камфорту яе жыхароў, каб у гаспадароў вызвалялася больш часу на іншыя заняткі. Вось калі настаўнікі скажуць: «Як здорава, што ў мяне з'явіўся час на творчасць, развіццё, на прафесійнае самаўдасканаленне», можна будзе казаць, што рэфармаванне прайшло і прайшло паспяхова. У нас былі добрыя пачынанні, але ў 2008 годзе мы, вобразна кажучы, з «хрушчоўкі» пераехалі ў зямлянку. Зноў вярнуліся ў савецкую сістэму адукацыі, якая не адпавядае сённяшнім рэаліям. Таму я лічу, што рэформа нам патрэбная. Неабходна з зямлянкі перайсці ў нармальнае жытло з каналізацыяй, водаправодам, ацяпленнем, каб можна яго было потым уладкоўваць. Рэформа павінна быць і ў змесце, і ў тэхналогіях, і ў метадыках, і ў сістэме кіравання адукацыяй. Трэба даць большую свабоду настаўнікам...

**Алена ГАРБАР:**

— І я лічу, што рэформа школы не адбылася, хоць і рабілася некалькі спробаў. Дзіця прыходзіць у школу на 11 гадоў. Скажыце, а хто-небудзь спрабаваў спрагназаваць, якія патрабаванні будуць прад'яўляцца да выпускнікоў праз 11 гадоў? На што іх трэба арыентаваць? А ці задумваемся мы над тым, што тое, што сёння бачыцца нам правільным, праз 10—15 гадоў можа аказацца не такім ужо і прыдатным. Як далёка мы зазіраем? Можа, галоўнымі павінны быць не толькі веды і ўменні, а развіццё асобы, каб выпускнік мог без праблем адаптавацца да жыцця па-за школай, мог прымяніць свае веды на практыцы. Мы вучым дзяцей таму, што, на наш погляд, можа спатрэбіцца ім у жыцці, але можам і памыліцца. А хочацца, каб настаўніцкая парада не аказалася бескарыснай.

**Анатоль ГЛІНСКІ:**

— А я супраць рэформы. У нас вельмі шмат становічага ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі ўжо зроблена: трэба проста ўзяць гэта за аснову і рухацца далей. Навошта нам разбураць усё, што было створана ўжо ў XXI стагоддзі? Сучасная беларуская школа — частка соцыуму, і ў ёй адлюстроўваецца ўсё — і эканамічныя, і палітычныя, і сацыяльныя з'явы, таму яна не можа не змяняцца разам з грамадствам. Абмяркоўваць трэба не рэформу, а ўдасканаленне адукацыйнага і выхаваўчага працэсу. Упэўнены, што на сённяшні дзень многія пытанні, якія тычацца якасці адукацыі, залежаць у першую чаргу ад настаўніка: ад узроўню яго кампетэнцыі і прафесійнай культуры.

## Каб скрыпка Страдзівары загучала...

**«ЗВЯЗДА»:** ***Скажыце, а наколькі апраўдана механічнае завучванне законаў, формул і гістарычных дат? Увогуле, ці маюць каштоўнасць механічна завучаныя факты? Магчыма, куды больш важна ўмець працаваць з інфармацыяй і ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі?***

**Ларыса ВАЛЫНЕЦ:**

— Мы проста абавязаны навучыць нашых дзяцей самастойна здабываць веды. Але ёсць фундамент, на якім стаіць гістарычная навука. І нават тэсты пабудаваны так, што калі ты штосьці не зазубрыў, то высокі бал не атрымаеш. Пэўныя рэчы сапраўды патрабуюць механічнага завучвання. Але для мяне важнае разуменне вучнямі той эпохі, якую мы вывучаем. Калі яно ёсць, то вучань лагічным шляхам, нават падчас тэсціравання, заўсёды зможа знайсці правільны адказ.

**Анатоль ГЛІНСКІ:**

— Ёсць рэчы, якія трэба проста ведаць (законы, формулы, даты). Ведаючы іх, усё астатняе можна проста «здабыць».

**Інэса ЗУБРЫЛІНА:**

— Шэрлак Холмс параўноўваў сваю галаву з пустым гарышчам, куды можна напакаваць усё што заўгодна. Многія так і робяць: цягнуць туды патрэбнае і непатрэбнае. І нарэшце надыходзіць момант, калі самую неабходную рэч туды ўжо не запіхнеш. Ці яна схаваная так далёка, што яе не дастанеш. «Я ж раблю ўсё па-іншаму. У маім «гарышчы» толькі неабходныя мне інструменты. Іх шмат, але яны ў ідэальным парадку і заўсёды пад рукой. А лішняга смецця мне не трэба...» — казаў герой твораў Конан-Дойла. Вобразна, але па сутнасці.

**Вольга ЛАГУНОВА:**

— Я не магу сёння прымусіць дзіця проста прачытаць параграф і пераказаць яго, бо элементарнае веданне тэорыі ў сучасным свеце неэфектыўнае, а гэта значыць, што ўрок павінен быць практыка-арыентаваным. Але ці ўсе педагогі гатовы працаваць па новых тэхналогіях? І хто ў гэтым вінаваты? Калі ў нас у каляндарна-тэматычным планаванні прапісаны адзіныя мэты, то пра якую творчасць можа ісці размова? Настаўніка заганяюць у пэўныя рамкі. Што мы чакаем ад яго, калі ёсць усё гатовае? Усё прыкладнае ўспрымаецца як абсалютнае. Я прыходжу на ўрок да маладых настаўнікаў і чую: «Дык усё ж гатовае ёсць...»

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Сёння ўжо існуюць тэхналогіі, якая дазваляюць нават складаныя для вучняў тэмы падаваць проста і лагічна, яны ўсе пабудаваны на законах работы мозга. Галоўная роля ў тэхналагічным забеспячэнні паскоранага развіцця адукацыі належыць, канешне, асобе настаўніка. Менавіта ад яго майстэрства, ад яго бачання прадмета, ад яго разумення і сітуацыі, і патрэб вучня залежыць, якая тэхналогія будзе прыменена для вырашэння той ці іншай дыдактычнай задачы. Ва ўмелых руках тэхналогія будзе «іграць», як скрыпка Страдзівары. А калі, прабачце, рукі не пад тое «заточаныя», то нават інструмент геніяльнага майстра ў іх не загучыць!

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Проста веды без кампетэнцый нічога не вартыя. Калі я ведаю, як націскаць на педалі, гэта яшчэ не значыць, што я ўмею добра ездзіць.

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Калегі, калі мы самі не ведаем, што нас чакае праз 10—15 гадоў, значыць, і нашых выхаванцаў трэба вучыць жыць ва ўмовах нявызначанасці, непрадказальнасці, праблемнасці, вучыць іх лёгкай адаптацыі, мабільнасці, гнуткасці ў розных сітуацыях.

Толькі задумайцеся: больш як 900 школ удзельнічаюць у інавацыйнай дзейнасці, але прарыву яны не даюць. Чаму? Прафесійныя кампетэнцыі можна падзяліць на тры ўзроўні. Рэпрадуктыўны — раблю тое, што сказала кіраўніцтва ці загадала міністэрства. Пошукавы — пашукаю, як гэта робяць іншыя. І трэці ўзровень — жаданне зрабіць па-свойму. На жаль, да крэатыўнага, творчага ўзроўню інавацыйнай кампетэнтнасці большасць настаўнікаў і школ у інавацыйных праектах пакуль не даходзяць. Гэта праблема, над вырашэннем якой трэба ўсім шмат і вельмі настойліва працаваць.

## Балы, рэйтынгі, працэнты...

**«ЗВЯЗДА»:** ***Амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах дзяцей яшчэ ў школе вучаць узаемадзейнічаць у камандзе, разам шукаць вырашэнне тых ці іншых праблем. Перад педагогамі ставіцца задача — спрыяць сацыяльнай мабільнасці сваіх выхаванцаў, вучыць дзяцей прымаць самастойныя рашэнні і несці за іх адказнасць. Наколькі гэта актуальна для беларускіх школ?***

**Вольга ЛАГУНОВА:**

— Праектныя тэхналогіі і праца ў групах шырока практыкуюцца нават маладымі настаўнікамі. У гэтым мы не адстаём, а, можа, нават і занадта захапляемся.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— А вось мае вучні прызнаны на трэцім уроку заявілі, што яны не хочуць гуляць, а хочуць вучыцца. Пытаюся ў іх, што яны маюць на ўвазе? Адказваюць: «Гэта значыць, што вы будзеце расказваць, а мы слухаць». Таму што калі яны «гулялі», яны вучыліся самі, а ім гэта не хацелася рабіць. Больш звыклая для школы пасіўная пазіцыя вучня на ўроку для іх аказалася больш блізкая.

**Алена ГАРБАР:**

— Тое, наколькі часта мы выкарыстоўваем інтэрактыўныя метады работы, залежыць ад таго, па якіх крытэрыях ацэньваюць настаўніка. Па выніках ЦТ? Па ўдзеле вучняў у даследчых праектах і алімпіядах? Зараз я працую ў сельскай школе і атрымліваю каласальнае задавальненне. Але аддзел адукацыі чакае, калі ў мяне з'явяцца пераможцы на алімпіядах. Як гэта, каб у настаўніка-метадыста за чатыры гады працы на новым месцы не было пераможцаў алімпіяд? А яны ў мяне ўжо былі, і сёння ў маёй рабоце іншыя прыярытэты. Мне куды больш цікава падрыхтаваць дзяцей да самастойнага жыцця па-за школай, каб пасля засялення ў студэнцкі інтэрнат ім было прасцей адаптавацца, каб у новым калектыве не ўзніклі складанасці і канфлікты, каб яны маглі праявіць найлепшыя свае якасці. І калі я іду на ўрок, то перада мной паўстае дылема: працаваць на патэнцыяльных алімпіяднікаў і забыцца пра ўсіх астатніх ці ўсё ж такі працаваць на ўсіх?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СІСТЭМЕ КААРДЫНАТ



Вольга ЛАГУНОВА.



Тамара МАЦКЕВІЧ.



Ларыса ВАЛЫНЕЦ.



Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Ларыса ВАЛЫНЕЦ:**

— Я выкладаю тры прадметы: сусветную гісторыю, грамадазнаўства і гісторыю Беларусі. Два з іх я вяду адным спосабам: мы гуляем на занятках, робім праекты, і я атрымліваю ад урокаў каласальнае задавальненне. І зусім па-іншаму, асабліва ў старшых класах, у нас праходзяць урокі па гісторыі Беларусі, таму што ў 11-м класе нам трэба здаваць абавязковы экзамен. І без механічнага завучвання на памяць там проста немагчыма абысціся...

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Ацэньванне працы і школы, і настаўніка — вельмі балючае пытанне. Для гэтых мэт у нас па-ранейшаму выкарыстоўваецца не зусім сучасны метад — інфармацыйна-статыстычны: колькі справаздач напісана, у якой колькасці конкурсаў паўдзельнічалі, колькі алімпіяднікаў падрыхтавалі, колькі метраў агароджы пафарбавалі і гэтак далей. Балы, рэйтынгі, працэнты — вось што не дае настаўніку расслабіцца... Назавіце мне хоць адзін аддзел адукацыі ці дырэктара школы, які б цаніў настаўніка за тое, што той дапамог камусьці са сваіх вучняў стаць Чалавекам, выцягнуў яго з бездані, чымсьці здолеў яго захапіць, павесці за сабой. Дырэктар, хутчэй, скажа: мне патрэбныя перамогі на алімпіядах...

***«ЗВЯЗДА»**: Ёсць меркаванне, што людзі ў нашы дні прызвычаіліся атрымліваць інфармацыю гукавымі порцыямі — 6—8-секунднымі байтамі. Карцінкі ў тэлевізары і на камп'ютары пастаянна змяняюцца, а час працы з кнігай, наадварот, скарачаецца. Сучасным вучням стала цяжэй утрымліваць сваю ўвагу, а настаўніку — адпаведна ўтрымліваць увагу класа. І перад педагогамі паўстае няпростая задача — як зрабіць так, каб дзеці працавалі на ўроку дастаткова прадуктыўна, але ўрок іх не стаміў. Між іншым, бацькі скардзяцца на загружанасць дзяцей дамашнімі заданнямі...*

**Алена ГАРБАР:**

— Калі дзіця да ночы выконвае заданне настаўніка, гэта выключна недапрацоўка педагога. Кожны, хто валодае методыкай выкладання, ведае ўзроставыя асаблівасці сваіх вучняў, ведае, колькі разоў на ўроку трэба змяняць віды дзейнасці, якія формы выкарыстоўваць для таго ці іншага ўзросту. Вядома, асноўны аб'ём работы павінен выконвацца на ўроку. А прызначэнне дамашняга задання — замацаваць атрыманыя веды, а не прайсці ўвесь той матэрыял, які не паспелі разабраць з настаўнікам на ўроку...

**Інэса ЗУБРЫЛІНА:**

— Мае вучні здзіўляюцца, калі я не задаю ім заданне дадому. Здзіўляюцца, што на ўроку адсутнічае такі этап, як праверка дамашняга задання. Не разумею, што я магу яго праверыць іншымі спосабамі на працягу ўсяго ўрока. Яшчэ адна наша памылка — адсутнасць індывідуалізацыі. Нельга ўсім нашым выхаванцам даваць аднолькавыя заданні на дом...

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Гэта глабальная праблема, якая патрабуе новых рашэнняў і падыходаў. Тэхналогіі хуткай работы з інфармацыяй ужо ёсць. Мадэліраванне як спосаб мыслення і пазнання вельмі эфектыўнае ў любой сферы дзейнасці. І ніхто не стамляецца, і ўсім вучыцца лёгка і радасна. Справа ў нашай інерцыі...

**«Рэформа павінна быць і ў змесце, і ў тэхналогіях, і ў методыках, і ў сістэме кіравання адукацыяй. Трэба даць большую свабоду настаўнікам...»**

**Інэса ЗУБРЫЛІНА:**

— ...І ў праблеме павышэння кваліфікацыі. Трэба максімальна прыцягваць настаўнікаў, каб яны бачылі, як праце ўсё новае. Але не трэба слепа капіраваць чужы ўрок. Досвед іншых павінен падштурхоўваць да ўласных пошукаў. Асабіста я не змагу правесці два аднолькавыя ўрокі ў розных класах...

## А што ў школьным люстэрку?

***«ЗВЯЗДА»**: Любыя новаўвядзенні ўпіраюцца ў канкрэтных людзей, якія павінны іх укараняць. Але ёсць меркаванне, што ў педагогаў няма на гэта ні псіхалагічных, ні фізіялагічных, ні адукацыйных рэсурсаў. Сёння нашы педагогі і дырэктары неабгрунтавана перагружаны. Праўда, яны не страцілі пачуццё гумару і гавораць пра гэта так: «У сістэме адукацыі 8-гадзінны рабочы дзень: з 8 раніцы да 8 вечара...»*

**Ларыса ВАЛЫНЕЦ:**

— Вельмі важна, хоча настаўнік вучыцца ці не? Мне цікава ўсё, і таму я гатова быць на любым семінары, які дапаможа ў развіцці. Але ёсць дастаткова вялікая катэгорыя педагогаў, якіх задавальняе ўсё. І калі спрабуеш іх расшавяліць, то чуеш у адказ: «Ну што ты там яшчэ прыдумала?»

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Японцы правялі даследаванне і высветлілі, што любы калектыў можна падзяліць на тры часткі. Прадстаўнікі першай любую прапанову ўспрымаюць на «ўра». Большая частка кажа: «Гэта цікава, мы падумаем...» І ёсць яшчэ пяць-шэсць працэнтаў людзей, якія застаюцца ўбаку. Дык вось, абапірацца трэба на тых, якія думаюць. З тымі, хто «ўра! ура!», трэба быць асцярожнымі, а на трэціх лепш увогуле махнуць рукой і пра іх забыць. Так лічаць японцы. У беларускіх школах ёсць унікальныя педагогі, але мала груп прарыву, а адзіночкам складана здзейсніць рэвалюцыю. Для гэтага патрабуецца смеласць і нават педагагічная дзёрзкасць.

**Інэса ЗУБРЫЛІНА:**

— Далёка не кожны настаўнік сёння рэалізуе свой патэнцыял, паколькі мы ўсе пастаянна абмежаваныя нейкімі рамкамі. Я, напрыклад, апошнія два гады, прагледаючы газеты, жыву ў чаканні нейкіх важных рашэнняў. Таму што два гады таму я ўваходзіла ў камісію па рэфармаванні сістэмы адукацыі, якую ўзначальваў старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Генадзь Пальчык. Мы збіралі інфармацыю з розных школ, вывучалі, якія функцыі выконваюць настаўнікі, колькі ў іх не ўласцівых абавязкаў, з-за якіх не застаецца часу на прафесійнае развіццё. Трэба, нарэшце, навучыцца расстаўляць прыярытэты — ёсць дзіця і яго патрэбы, а мы настаўнікамі спрабуем закрыць усе магчымыя праблемы, якія ўзнікаюць. А самы неабаронены, напэўна, дырэктар школы, таму што ён павінен дагадзіць усім: мясцовым уладам, міністэрству, настаўнікам, бацькам сваіх вучняў...

Два гады таму паралельна дзейнічалі тры камісіі. Усе склалі свае справаздачы. Але ні адзін з прапанаваных пунктаў так і не быў рэалізаваны. Калі ты хочаш штосьці змяніць, то аналізуеш, спрабуеш знайсці нейкае выйсце, вывучаеш вопыт суседзяў. Я не прыхільнік заходняй сістэмы адукацыі, хоць дзякуючы свабоднаму валоданню англійскай мовай у мяне ёсць магчымасць чужы досвед дасканала вывучыць і паспрабаваць прымяніць на практыцы. Больш таго, я вельмі перажываю, калі хтосьці з маіх вучняў з'язджае з краіны. Я сябе лічу ў пэўнай ступені вінаватай, бо атрымліваецца, што я іх вучу так якасна, што яны затым могуць свабодна атрымліваць адукацыю ў іншых краінах. Але мы не можам жыць ізалявана, за жалезнай заслонай. Школа — гэта люстэрка грамадства. І калі на гэтым люстэрку ёсць нейкія плямы, то трэба ліквідаваць іх сумеснымі намаганнямі.

## Абвінавачваць ці супрацоўнічаць?

***«ЗВЯЗДА»**: Сёння нават маладыя бацькі спрабуюць даваць свае рэкамендацыі і вучаць настаўніка таму, як вучыць, чаму вучыць і якім па ліку павінен стаяць у школьным раскладзе той ці іншы ўрок... У медыцыне ўрач пускае пацыента і яго сваякоў на сваю тэрыторыю толькі да пэўнай мяжы. А далей ужо ніхто не перашкаджае яму выконваць прафесійныя функцыі і абавязкі... Магчыма, самі настаўнікі вінаватыя ў тым, што бацькі страцілі да іх павагу як да прафесіяналаў?*

**Вольга ЛАГУНОВА:**

— Бацькі, якія скончылі школу 10—15 гадоў таму, адкрываюць школьны падручнік, усё ў ім падаецца такім складаным і незразумелым, і ўзнімаецца хваля незадавальнення. Навука ідзе наперад, і бацькі не ў стане за ёй паспець. Таму ўзнікае не зусім здаровая сітуацыя: настаўнік спрабуе падзяліцца з вучнямі ведамі, а бацькі кажуць: «Нам столькі не трэба». Я не гісторык, але з цікавасцю зазірнула ў новы падручнік па гісторыі для шостага класа. І ўжо з трывогай чакаю падручнікаў па біялогіі — лічу, што нельга так спустошваць навуку. Мы не можам не ўзбройваць сваіх вучняў ведамі. Калі кажам, што трэба бацькоў допусціць да адукацыйнага працэсу, гэта не азначае, што яны будуць вучыць настаўніка, як весці ўрок, як даваць веды і якія адзнакі ставіць. Калі будзем слухаць усіх, то прыходзіць да нас, то зламаем дзіця.

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Сёння мы назіраем узаемную незадаволенасць бацькоў — педагогамі і работай школы, педагогаў — бацькамі, перакладанне віны з хворай галавы на здаровую, маўляў, бацькі не дагледзелі, не пракантралявалі, школа не вучыць, а толькі патрабуе, праграмы складаныя, падручнікі незразумелыя і гэтак далей. Усе тыкаюць пальцам на школу. І што ж рабіць? Адказы знайсці самаўды складана. Бацькі часта не разумеюць сваіх дзяцей, таму што не ведаюць іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей, здольнасцей, інтарэсаў і патрэб, асабліва ў перыяд сталення. У школе, на бацькоўскіх сходах, дзе промахі і няўдачы дзяцей абмяркоўваюцца публічна, бацькі адчуваюць сябе няўтульна і з нецярплівасцю чакаюць іх заканчэння. У большасці выпадкаў такія бацькі проста адмоўчваюцца, саромеюцца задаваць пытанні і не ведаюць, дзе шукаць дапамогу.

Доктар медыцыны і псіхалогіі Уладзімір Леві пісаў: «Вялікі сакрэт выхавання: хочаце выхаваць дзіця, пачынайце выхоўваць яго бацькоў». Але як прыцягнуць бацькоў, асабліва тых, хто не ведае сваіх дзяцей і мае цяжкасці ў іх выхаванні, у школу? Як стварыць умовы, каб ім захацелася з настаўнікам супрацоўнічаць? Як матываваць бацькоў да навучання і самаадукацыі? Улічваючы значнасць праблемы, сёння ў адзінаццаці ўстановах адукацыі распачалася праца па ўкараненні мадэлі павышэння псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў. Гэты праект — запрашэнне да двухбаковага эфектыўнага супрацоўніцтва. Аляксандр Македонскі казаў, што ён удзячны свайму бацьку за тое, што той падарыў яму жыццё, і свайму настаўніку, які напоўніў яе сэнсам. Нашы вучні павінны быць удзячныя і бацькам, і настаўніку. У кожнага свая місія. І паколькі мы робім агульную справу, мы не павінны ні абвінавачваць адзін аднаго, ні папракаць адзін аднаго.

**Ларыса ВАЛЫНЕЦ:**

— Хацелася б вярнуцца да асобы настаўніка. Два гады ў мяне не было класнага кіраўніцтва. Але ў гэтым навучальным годзе мне дасталіся пяцікласнікі ад выдатнага настаўніка пачатковай школы. Цудоўныя дзеці і такія ж цудоўныя бацькі. І заслуга ў гэтым цалкам належыць іх першай настаўніцы, якая прывучыла бацькоў працаваць разам з ёй літаральна з першага класа. Яны жылі адной вялікай сям'ёй. Таму я кожны дзень атрымліваю ад стасункаў з бацькамі неверагоднае задавальненне.

## Паглядзець у вочы будучыні

***«ЗВЯЗДА»**: Фіналістам сёлетняга конкурсу «Настаўнік года Расіі» было прапанавана напісаць эсэ на тэму «Настаўнік — прафесія далёкага дзеяння». Калі б такая задача была пастаўлена перад вамі, што б вы напісалі? Якія б аргументы прывялі на карысць свайго прафесійнага выбару?*

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Я 17 гадоў працавала ў Акадэміі навук, а потым перайшла ў ліцэй выкладаць фізіку. Было ўражанне, што ў мяне выраслі крылы. Я раптам зразумела — вось яно, сапраўднае жыццё, зразумела, што магу прыносіць камусьці карысць. Але калі ў мяне пыталіся, кім я працую, чамусьці было няёмка прызнацца, што настаўнікам, хоць у навуковых работнікаў фінансавы статус быў не лепшы. Цяпер я ведаю, што прафесія настаўніка — самая лепшая ў свеце. Ні адзін акцёр, рэжысёр, мастак не мае такога поля для творчасці, ні адзін палітык не мае столькі паўнамоцтваў для фарміравання будучыні, колькі мае настаўнік. Але нам усім трэба зрабіць так, каб гэта зразумела ўсё грамадства.

**Анатоль ГЛІНСКІ:**

— Аднойчы адзін вельмі паважаны педагог сказаў мне: «Перш чым стаць для кагосьці цікавым, трэба быць цікавым самому сабе». Для таго, каб стаць настаўнікам, трэба быць яркай і пазітыўнай асобай, а ўсё астатняе потым прыйдзе, у тым ліку і прафесіяналізм. Але калі ты нецікавы сабе, то лепш не ісці ў педагогіку.

**Вольга ЛАГУНОВА:**

— Настаўнік як канатаходзец. Ты ўвесь час наверсе, адзін, працуеш без падстрахоўкі. Паставіў неакуратна нагу — і ўсе ахнулі. Аступіўся... і ўсе пайшлі далей па сваіх справах. Таму ты не маеш права ўпасці, ты павінен быць увесь час там, наверсе, кіраваць сваімі эмоцыямі. Наша прафесія ўвогуле вельмі эмацыянальна затратная. Таму кожны настаўнік павінен быць гатовы да таго, што яго праца — гэта служэнне.

**Алена ГАРБАР:**

— Не магу сказаць, што марыла стаць настаўнікам з дзяцінства. Выбар быў здзейснены літаральна ў апошнія месяцы да заканчэння школы. Але за 30 гадоў педагагічнай працы ў мяне ніколі не было шкадавання. Лічу, што педагогам можа быць толькі чалавек, які гатовы прыняць усю адказнасць за свае дзеянні. Што я маю на ўвазе? Мая былая вучаніца (аспірантка, малодшы навуковы супрацоўнік, павінна ў хуткім часе абараняць кандыдацкую) з горыччу сказала мне: «Гэта вы вінаватыя, што я выбрала гэты шлях...» Не паспрачаешся... У яе расчараванні ёсць і мая віна.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Мне мая вучаніца, якая з'ехала атрымліваць адукацыю і засталася за мяжой, таксама сказала, што я вінаватая ў тым, што не папярэдзіла яе, што мы там нікому не патрэбныя. І яна мела рацыю. Мы павінны расціць свядомых грамадзян для сваёй краіны, арыентаваных на тое, што і самарэалізоўвацца трэба на сваёй радзіме, і ствараць матэрыяльны дабрабыт трэба тут. Бо там мы заўсёды будзем чужымі...

**Ларыса ВАЛЫНЕЦ:**

— І я за 20 гадоў ніколі не пашкадавала аб сваім выбары. Неад'емны плюс прафесіі педагога ў пастаянным нашым самаўдасканаленні. Ты ніколі не стаіш на месцы, пастаянна расцеш у прафесійным плане. Ты ўвесь час у тэме, таму што стасуешся і з пяцікласнікамі, і з адзінаццацікласнікамі. Знаходзішся на прамой сувязі з кожным пакаленнем. Мы ўвесь ўдзельнічаюць у інтэрнэт-праекце, і мае з імі стасункі заканчваюцца ў сецібе далёка за поўнач. Сочыш за сваімі вучнямі і пасля таго, як яны заканчваюць школу, атрымліваюць прафесію, ствараюць сям'ю, у іх нараджаюцца дзеці. Ні адна іншая прафесія не можа прапанаваць такі варыянт.

**Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ:**

— Так, прафесія педагога — унікальная: яна самая галоўная, самая творчая, самая цяжкая, самая нервовая і бязлітасная, самая небяспечная, самая высакародная і ўдзячная, самая інтэлектуальная і рамантычная. Па напружанасці работу настаўніка можна параўнаць з работай авіядыспетчара моцна загружанага міжнароднага аэрапорта ў цяжкіх метэаўмовах: то ўзлёт, то пасадка; то дажджы, то туман.

Наша прафесія ўнікальная яшчэ і тым, што мы жывём адначасова ў трох вымярэннях. Абапіраемся на мінулае, працуем на патрэбы сённяшняга дня, але жывём пераважна ўжо ў будучыні: сваімі думкамі, справамі і пачуццямі. Ні ў адной прафесіі няма такой магчымасці — глядзець штодзённа вочы ў вочы сваёй будучыні, у гэтыя адкрытыя, даверлівыя, цікаўныя, гарэзлівыя, смелыя (я магу працягваць бясконца) вочы сваіх вучняў. Але гэта не толькі вялікае задавальненне, але і велізарная адказнасць — кожны дзень напаўняць жыццё дзіцяці сэнсам, спраўджваць яго чаканні. І калі праз шмат гадоў пасля заканчэння школы праз сеціва з усяго свету я атрымліваю ад сваіх былых вучняў словы ўдзячнасці, гэта не мае цаны. Больш сур'ёзнай і высакароднай справы на Зямлі проста няма.

І хоць мы ўсе, хто сабраліся за гэтым сталом, шчаслівыя ў сваёй прафесіі, вельмі хочацца, каб нас яшчэ і крышачку больш разумелі, прыслухоўваліся, а можа быць, і крышачку нам дапамагалі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

*(Поўны тэкст «круглага стала» шукайце на партале www.zviazda.by)*

XXIII Мінскі міжнародны кінафестываль Лістапад 2015

# «Лістапад» агучыў найлепшыя фільмы



Фота БЕЛТА.

## На цырымоніі закрыцця Мінскага міжнароднага кінафестывалю сталі вядомыя вынікі дэбатаў журы

**Цырымонія закрыцця 23 Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», на якой сталі вядомыя пераможцы сёлетняга форуму, прайшла ўчора ў кінатэатры «Масква».
Да асноўнага аналізу праграмы і вынікаў фестывалю мы звернемся ў наступных публікацыях. А сёння карэспандэнт «Звязды» Ірэна Кацяловіч, якая сёлета была ў складзе журы, распытала сваіх калег па судзейству, шаноўных гасцей, пра іх уражанні ад мінскага «Лістапада».**

**Кінакрытык і прадзюсар Андрэй АЛФЁРАЎ, член міжнароднага журы кінапрэсы:**

— Абодва конкурсы ігравога кіно — асноўны і «Маладосць на маршы» — невідавочна тэматычна зарыфмаваныя: тут сабраны драмы нядаўняга мінулага і драмы з мінулага, што растварыліся ў сучаснасці і яе вызначаюць. Напрыклад, літоўскі «Святы» з конкурсу «Маладосць на маршы» — такая ж ахвяра (хай і генетычная) нядаўняга сацыялістычнага рэжыму, як герой польскага «Чырвонага павука», драмы «Я, Вольга Гепнарова» ці ізраільскага «Допыту» і малдаўскай «Анішоары». Апроч гэтага, абодва конкурсы знітаваны вострым жаданнем аўтараў выказацца новымі выразнымі сродкамі. Таму ў абедзвюх праграмах такая колькасць эксперыментаў. Выбраць пераможцаў было вельмі няпроста. Вельмі! Гэта такі маленькі выбар Сафі (калі хто памятае знакамітую драму з Мэрыл Стрып). У конкурсах так многа добрых нумароў, што адчуваеш пакуты сумлення, калі ўзнагароджваеш адных і пазбаўляеш прызоў іншых.

**Рэжысёр і рэжысёр мантажу Кутайба БАРХАМДЖЫ, член журы Асноўнага конкурсу дакументальнага кіно:**

— Мы паглядзелі дванаццаць фільмаў з розных краін і розных культур, аб прыватных сітуацыях і грамадстве ў цэлым, дэбютных карцін і работ сталых, вядомых рэжысёраў. Хоць не ўсе яны былі створаны ў краінах СНД, аўтары разважалі на актуальныя і для гэтай прасторы тэмы. Як, напрыклад, знятая ў Мексіцы «Саламанка», якая таксама адлюстроўвае тэндэнцыю змешвання дакументальнага і ігравога кіно. Гэтым жа характэрная карціна «Х'юстан, у нас праблема», якая ўвесь час уводзіць у зман, дзе рэальнасць, а дзе не, змешвае гульню з архіўнымі матэрыяламі, рэальных асоб з акцёрамі. Цікава было глядзець, як у сучасным дакументальным кіно працуюць і становяцца ўсё больш моцнымі жанчыны, якія праз адмысловы погляд паказваюць сацыяльныя праблемы. Адзін з такіх прыкладаў — «Прычасце» Ганны Замецка. Пра тое, што рэжысёрам з'яўляецца жанчына, мы маглі б здагадацца па тым, як яна пагльбляецца ў інтымнае жыццё сям'і і па-асабліваму паказвае яго праз эмоцыі, перажыванні і сумленны погляд. У процівагу гэтай дэбютнай карціне абсалютна іншае бачанне ў масцітага аўтара Сяргея Лазніцы — яго цяжкі эксперыментальны фільм «Аўстэрліц» падобны на дысертацыю пра вялікае мастацтва, на музейны экспанат. Нам было складана выбраць лепшае якраз таму, што кіно ў конкурсе — такое рознае.

**Рэжысёр Дэні КАТЭ, старшыня журы конкурсу «Маладосць на маршы»:**

— Я прыехаў на Мінскі кінафестываль па асабістых прычынах, бо даўно вельмі глыбока цікаўлюся Усходняй Еўропай і Расіяй. Беларусь для мяне была загадкавым месцам, я не вельмі шмат ведаў пра краіну. У выніку загадкавы Мінск аказаўся вельмі прыемным горадам, а фестываль, які, на жаль, не вельмі добра вядомы ў свеце, — вельмі прафесійным. Я пастараюся, каб як мага больш людзей ведалі пра «Лістапад», і сам гатовы прыязджаць сюды зноў. У конкурсе «Маладосць на маршы» наша журы паглядзела дванаццаць карцін — ад цудоўных да дрэнных (для мяне). Я бачу, што дырэктар праграмы стараўся сабраць як мага больш розных фільмаў, але некаторыя з іх, з майго пункту гледжання, падыходзяць хутчэй для камерцыйных ці тэлевізійных паказаў, чым для кінафестывалю. Я быў вельмі шчаслівы, што на «Лістападзе» можна ўбачыць фільмы, што «прагучалі», напрыклад, на Канскім кінафестывалі. Мне ўдалося паглядзець фільм «Тоні Эрдман» Марэн Эдэ, які я раней не бачыў. Цягам дванаццаці гадоў я не ўпускаю магчымасці ездзіць і ўдзельнічаць у міжнародных кінафестывалях. І на «Лістападзе» мне асабліва спадабалася адна рэч, якую я не бачыў нідзе, апроч Мінска: перад пачаткам кожнага фільма праграмны дырэктар Ігар Сукманаў выходзіць, каб патлумачыць кантэкст фільма, што можа дапамагчы гледачам яго зразумець. Я хацеў бы, каб такое практыкавалася на іншых фестывалях. Да таго ж кожны фільм суправаджаюць субцітры на англійскай мове, хоць патрэбу ў гэтым маюць, можа быць, толькі тры чалавекі. Такія дробязі тут прадуманы.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

### Асноўныя ўзнагароды

**Гран-пры «Золата «Лістапада» — за лепшы фільм**
«Лілі Лейн» (Венгрыя, Германія, Францыя), рэжысёр Бенэдэк «Бенс» Флігаўф
**Прыз «Серабро «Лістапада» ў намінацыі «Фільм як з'ява мастацтва»**
«Мімоза» (Марока, Іспанія, Францыя, Катар), рэжысёр Олівер Лакс
**Прыз глядацкіх сімпатый «Бронза «Лістапада»**
«Слава» (Балгарыя, Грэцыя), рэжысёры Крысціна Грозева, Петар Вылчанаў

### Асноўны конкурс ігравога кіно

**Прыз «За лепшую рэжысуру»**
«Я, Вольга Гепнарова», рэжысёры Томаш Вайнрэб, Петр Казда
**Прыз «За лепшую аператарскую работу імя Ю.А. Марухіна»**
«Сьераневада», аператар Барбу Баласою
**Прыз «За лепшую жаночую ролю»**
Міхаліна Альшанска, «Я, Вольга Гепнарова», рэжысёры Томаш Вайнрэб, Петр Казда
**Прыз «За лепшую мужчынскую ролю»**
Адрыян Тыцьені, «Атэстат сталасці», рэжысёр Крысціян Мунджыу
**Прыз «За лепшую жаночую ролю другога плана»**
Лія Бугнар, «Атэстат сталасці», рэжысёр Крысціян Мунджыу
**Прыз «За лепшую мужчынскую ролю другога плана»**
Адам Вароновіч, «Чырвоны павук», рэжысёр Марцін Кашалка
**Спецыяльны прыз журы**
«Атэстат сталасці», рэжысёр Крысціян Мунджыу

### Конкурс ігравога кіно «Маладосць на маршы»

**Прыз «За лепшы фільм конкурсу ігравога кіно «Маладосць на маршы» імя народнага артыста СССР кінарэжысёра В.Т. Турава»**
«Заалогія» (Расія, Германія, Францыя), рэжысёр Іван І. Твярдоўскі
**Спецыяльны прыз журы**
«Святы» (Літва, Польшча), рэжысёр Андрус Блажавічус

### Асноўны конкурс дакументальнага кіно

**Гран-пры «За лепшы дакументальны фільм»**
«Прычасце» (Польшча), рэжысёр Ганна Замецка
**Спецыяльны прыз журы**
«Аўстэрліц» (Германія), рэжысёр Сяргей Лазніца

### Нацыянальны конкурс

**Прыз «За лепшы мастацкі фільм»**
«Душы мёртвыя» (Беларусь), рэжысёр Віктар Красоўскі
**Прыз «За лепшы дакументальны фільм»**
«Саламанка» (Расія, Беларусь), рэжысёр Руслан Фядотаў, Аляксандра Кулак
**Прыз «За лепшы анімацыйны фільм»**
«Даша і людаед» (Расія), рэжысёр Наталля Сурыновіч
**Конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік»**
Абвешчаны 8 лістапада
**Прыз «За лепшы фільм»**
«Мікроб і бензін» (Францыя), рэжысёр Мішэль Гондры

### Спецыяльныя прызы

**Прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За гуманізм і духоўнасць у кіно»**
«Малітва Ліры» (Японія), рэжысёр Хіраюкі Куракава, Міюкі Кавасака

## Экслібрыс «Звязды»

# ПАДАРУНАК ДЛЯ МАКСІМА-КНІЖНІКА

**Максім Багдановіч. Я не самотны...: успаміны, артыкулы, вершы, пераклады. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. — 335 с.**




Ёсць такі жарт: падарункі бываюць трох відаў — добры, кепскі і кніга. Для тых, хто не збірае свае любімыя творы на паліцах хатняй бібліятэкі, не сочыць за навінкамі і ў цэлым чытаць не любіць, такая класіфікацыя гучыць сапраўды іранічна. Але для людзей «кніжных» атрымаць у падарунак новае выданне — вельмі значна. А для самога аўтара патрымаць у руках уласную кнігу акурат напярэдадні «дня нараджэння» — проста неверагоднае шчасце. Калі ж з дня смерці пісьменніка мінула амаль стагоддзе, такое выданне становіцца ўжо сімвалам памяці і прыхільнасці чытача.

Наш любімы Максім Багдановіч можа ўсміхнуцца з нябёсаў і быць упэўненым: ён не самотны, бо пра яго памятаюць. Яшчэ адным знакам таму стаў выхад новага зборніка успамінаў, артыкулаў, вершаў, перакладаў акурат напярэдадні 125-годдзя з дня нараджэння паэта, якое мы будзем шырока адзначаць праз месяц, 9 снежня. Праект рэалізаваны па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі.

Прыемная для дотыку мелаваная папера, мноства фотаздымкаў, выдатнае мастацкае афармленне, выканане вядомым майстрам Усеваладам Свентахоўскім. Пад вокладкай гэтай кнігі яе укладальнік, паэт Віктар Шніп, сабраў сапраўды самае адметнае і цікавае пра Максіма Багдановіча. Тут і ўспаміны яго бацькі, Адама Ягоравіча, і згадкі, напісаныя пра паэта сябрамі і паплечнікамі — Дзіядорам Дзябольскім, Змітраком Бядулем, Максімам Гарэцкім, Зоськай Верас, Вацлавам Ластоўскім і многімі іншымі. Суправаджаюць тэксты архіўныя фотаздымкі, некаторыя з іх шырокі чытач пабачыць упершыню.

Натуральна, не абышлася кніга без вершаў самога Максіма Багдановіча. Раздзелы, якія змяшчаюць паэтычныя творы, таксама адметныя ілюстрацыйным шэрагам. Але ён скампанаваны паводле іншых прынцыпаў. Тут выявы інфарматыўна дапаўняюць вершы, падаюць іх у кантэксце часу, з'яў тагачаснай і сённяшняй рэчаіснасці. Так, цалкам лагічна, што верш «Касцёл Святой Ганны ў Вільні» суправаджаецца выявай гэтага цудоўнага храма, а твор-прысвячэнне «С.Е. Палуяну» — партрэтам выдатнага публіцыста. Чытач можа пабачыць вокладкі зборнікаў, дзе друкаваліся творы Багдановіча, факсімільныя выявы старонак з легендарнай «Нашай нівы», аўтографы самога паэта, а таксама работы мастакоў, на стварэнне якіх натхнілі непаўторныя радкі Максіма.

Ёсць тут і іншыя адзнакі публіцыстычнага дыскурсу — вокладкі сучасных кніг, прысвечаных Багдановічу, зборнікаў яго твораў, што выдаваліся ў нашай краіне па-беларуску і за мяжой — у перакладзе на іншыя мовы; фотаздымкі з падзей, прысвечаных памяці Максіма Багдановіча. Яны адбываліся ў Яраслаўлі і Гродне, Ракуцёўшчыне і Мінску. Прыхільнікі класічнага падыходу да ўкладання кніг тут могуць абурыцца: навошта адцягваць увагу чытача ад самога твора — на выяву, а тым больш — фотаздымак, што ў прынцыпе непасрэдна з тэкстам не звязаны.

Але мне бачыцца, што ў дадзеным выданні такі падыход цалкам апраўданы: мы ж маем справу з кнігай, што мусіць стаць адзнакай памяці пра паэта і засведчыць нашу вялікую любоў і пашану да яго творчасці. А як гэта лепей зрабіць? Праз тэматычныя выстаўкі і літаратурныя імпрэзы, творчыя работы-прысвячэнні і адзнакі павагі да фактаў біяграфіі самога паэта. Таму і назва зборніка «Я не самотны...» набывае новую сімвалічнасць. А пад яго вокладкай скрываюцца сапраўдныя доказы захаплення талентам Максіма Багдановіча і яго творчасцю.

Дарэчы, заўсёды дзіўным падаваўся той факт, што ў вершах, публіцыстычных артыкулах ды нават і ў навуковых работах мы часам называем паэта, чый узровень таленту сувымерны з еўрапейскімі творцамі, — Максім. Вось так проста. Як знаёмага ці сябра — толькі па імені. Але калі задумацца — менавіта так найбольш лагічна звяртацца да чалавека, якога сапраўды любіш і паважаеш. Ён яшчэ не дарос да «Ягоравіча», не стаў «дзядзькам», а назаўжды застаўся такім родным і блізкім. Нашым. Проста Максімам.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# «...У БУДУЧЫНЮ ПАЗІРАЕМ МЫ»

## Ён вучыў пісаць і думаць па-новаму, трымаючыся традыцый

**Калі паразважаць глабальна, то творчы лёс Міхася Чарота можна назваць спраўджваннем «амерыканскай мары». І вось чаму. Сын беднага селяніна з Ігуменскага павета (сёння Пухавіччына), які з самага дзяцінства быў вымушаны шмат працаваць па гаспадарцы, здолеў атрымаць добрую адукацыю, стаць уплывовым творцам і нават больш — даць новай беларускай літаратуры свой голас. Сучасны. Адметны. Своечасовы. А яшчэ — быць паспяховым у прозе, драматургіі, арганізаваць цэлую творчую суполку... Міхась Чарот (сапраўднае імя Міхаіл Кудзелька), чыё 120-годдзе мы адзначылі 7 лістапада, спраўджваў сваю, беларускую мару, думаў пра справядлівасць і сацыяльную роўнасць. На жаль, жыццё яго трагічна абарвалася ў 1937 годзе, а многія творчыя задумкі так і засталіся нязд'зейсненымі.**

У літаратурным жыцці Чарот перажыў і славу, і забыццё. У паслярэвалюцыйны час яго віталі і захапляліся, а праз некалькі дзесяцігоддзяў — называлі яго вершы і паэмы нібыта застылымі ў часе, таму для нашчадкаў — зусім нязначнымі. Але мне падаецца, што менавіта постаць Чарота можна лічыць мастком паміж традыцыйнай «нашаніўскай» літаратурай і творчасцю новага кшталту — савецкай, індустрыяльнай. Менавіта ён навучыў паэтаў пісаць, думаць, разважаць па-новаму, але ў той жа час раіў прытрымлівацца традыцый і паважліва ставіцца да здабыткаў папярэднікаў.


Міхась Чарот — падлетак.

Нехта называе вершы Міхася Чарота рамантычнымі. Так, па сутнасці яны такія і ёсць, бо крыніцамі творчага натхнення для паэта былі вобразы роднай прыроды, фальклор, чароўнасць беларускай песні і казкі. У яго вершах

*...ціха шэпчацца чарот,*
*Лясун, русалка зарагоча...*
*А ў небе зорак карагод*
*Гарыць, нібы дзяўчынкі вочы.*

Дзіўна, але ўся гэтая чароўнасць мела карані ў цяжкім сялянскім побыце, складанай працы. Маленькі Міхась быў пастушком, працаваў на полі і сенажаці, любіў слухаць народныя песні, казкі. А яшчэ — захапляўся творчасцю Янкі Купалы. У сваёй аўтабіяграфіі ён пазней напіша: «Сачыняць пачаў, не ўмеючы пісаць. Браў народную песню і пераплятаў яе з выдуманымі ў рыфму радкамі». У жыцці былі беднасць, сваркі ў сям'і і нястача. Ва ўспамінах Міколы Хведаровіча, які добра ведаў Міхася Чарота, чытаем: «Назаўсёды запомнілася мне маленькая вясковая хаціна з падпёртымі сценамі, з дзіравай страхою. Маленькія акенцы яе прыплюшчана паглядалі з-пад нахмуранага застрэшша на далёкі разбег шырокага прастору, за якім цягнулася няроўная стужка сіняга лесу». Сам паэт у аўтабіяграфіі згадвае: «Сям'я вялікая. Прыйшлося жыць у надзвычайнай беднаце. Голад. Холад. А гэта было прычынай пастаяннай сваркі і лаянкі ў хаце».

**У 1926 годзе «Звязда» гучна пiша: «Паэмай «Босыя на вогнішчы» Чарот зрабіў у беларускай літаратуры (і зместам, і формай) рэвалюцыю».**

У сям'і было пяцёра дзяцей, але бацька паэта разумеў, як важна мець добрую адукацыю, каб уладкаваць жыццё і пазбегнуць цяжкай працы селяніна. Таму наймаў для дзяцей хатняга настаўніка — «дарэктара», а пазней — выпраўляў іх вучыцца ў горад. Так Міхась стаў навучэнцам Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Дарэчы, менавіта там ён пачаў задумвацца над сацыяльнымі пытаннямі, бачыў несправядлівасць становішча і стаў пісаць вершы, напоўненыя рэвалюцыйнымі думкамі. У аўтабіяграфіі ён піша: «Памятаю, калі Рэйнскі (настаўнік семінарыі. — **Аўт.**), прачытаўшы мой, гневам прасякнуты, верш, сказаў пацікy ў калідоры: «Рана птушачка запела, каб кошачка не з'ела... але нічога... пішыце — у вас ёсць талент... Толькі пішыце больш аб прыродзе. Навошта браць тэмы, на якія іншыя баяцца пісаць? Гэткіх вершаў нідзе не надрукуюць». Я нічога не адказаў яму. Але з гэтага часу мне хацелася пісаць такія вершы, якія нельга друкаваць пры цары».

Адным з найярчэйшых яго зборнікаў стаў самы першы — «Завіруха», які пабачыў свет у 1922 годзе. Паэт разумеў, што кнігу ўспрымуць як маніфест, таму ў прадмове папярэдзіў чытачоў і крытыкаў, загадзя адказаў на іх пытанні: «Дарэмна ў маім зборніку будуць шукаць якой-небудзь вызначальнай мастацкай ці палітычнай праграмы. Яе пакуль што няма. Мой зборнік хутчэй дынаміка, чым статыка».


Міхась Чарот. 1930-я гг.

Так, у пачатку 1920-х гадоў у беларускім грамадстве назіралася мноства змен, новае жыццё вымагала і новых літаратурных сродкаў для яго адлюстравання. Таму некаторыя творцы старэйшага пакалення аказаліся па-за часам. Максім Гарэцкі пісаў: «Пісьменнікі-нашаніўцы, яшчэ вельмі шчыльна звязаныя са сваімі даўнейшымі традыцыямі, цяпер або перажывалі крызіс, або дапісвалі свае даўнейшыя творы, або пісалі ўжо як савецкія пісьменнікі, але не маглі належна падысці да выканання пастаўленай перад імі задачы».

Максім Гарэцкі таксама піша: «Думка ўтварэння пэўнай арганізацыі, яскрава вызначанай лучнасці, лунала не раз сярод беларускіх песняроў і пісьменнікаў. Але часамі аб'ектыўныя ўмовы, а часамі суб'ектыўныя перашкаджалі ажыццявіць гэтую задуму, не давалі магчымасці аб'яднаць у адну цесную сям'ю беларускіх літаратараў». Так, у канцы 1923 года быў утвораны «Маладняк», і адным з яго заснавальнікаў стаў Міхась Чарот. Маладнякоўцы з усім юнацкім максімалізмам адкінулі патрабаванні «моднай фармальнай» школы: паэзіі дзеля паэзіі, формы дзеля формы, а таксама адмовіліся ад традыцый «старых расплыўчата-салодзенькіх вершаў». «Маладняк» уводзіць у беларускую літаратуру матывы, зусім новыя для тагачаснай рэчаіснасці, — будаўніцтва светлай будучыні і пераўтварэння прыроды, захапленне індустрыяльнымі магутнасцямі, тэхнікай. У вершаваным цыкле «Песні маёвыя» Міхась Чарот па-свойму інтэрпрэтуе класічны вобраз-сімвал Новай Зямлі. Для яго Зямля Новая — наша планета, якая імчыцца па новай арбіце да светлай будучыні. І гарантам гэтага стане «горад новы», які «пабудуем на багне-дрыгве» старога ладу.



Міхась Чарот у адпачынку. Шарж мастака Паўла Гуткоўскага. Часопіс «Маладняк», 1924 г.

Імкненнем працаваць і любоўю да стваральнай працы аб'ядноўвае паэт вобразы селяніна і пралетарыя ў вершы «Завод і зямля».

Услаўленнем рэвалюцыі і яе вынікаў прасякнуты літаральна кожны верш Міхася Чарота, напісаны ў гэты час. Ён імкнецца да выяўлення сваіх думак у больш маштабнай форме, малюе шырокія эпічныя палотны ў паэмах. Творчым адкрыццём стала яго паэма «Босыя на вогнішчы», якую часта параўноўваюць з вядомым творам «Дванаццаць» Аляксандра Блока. У 1926 годзе «Звязда» гучна піша: «Паэмай «Босыя на вогнішчы» Чарот зрабіў у беларускай літаратуры (і зместам, і формай) рэвалюцыю. Шлях Чарота — шлях беларускай літаратуры пасля Кастрычніка».


**Сустрэча беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў. Пачатак 1925 г.**
**Сядзяць *(злева направа)*: М. Хвылёвы, С. Піліпенка, Ц. Гартны, М. Чарот.**
***Стаяць:* 2-гі А. Бабарэка, 3-ці А. Вольны.**

Матыў лепшага жыцця і светлай будучыні гучыць у яго паэме «Беларусь лапцюжная». Сімвалам селяніна і вёскі становіцца вобраз лапця, увесь час аўтар суадносіць горад з яго сястрой, вёскай.

Так, безумоўна, у працы суполкі «Маладняк» было шмат станоўчых момантаў. «Маладнякоўцы» праводзілі вялікую работу. У Мінску час ад часу ладзілі літаратурныя вечарыны, дзе чыталі свае творы, часта выязджалі ў розныя гарады і мястэчкі, дзе расказвалі пра поспехі беларускай літаратуры, пра пісьменнікаў. Але былі і значныя недахопы ў дзейнасці аб'яднання: яны адмаўлялі спадчыну. Магчыма, прычына такой катэгарычнасці ў непрыманні традыцыйнай беларускай паэзіі і адмаўленні аўтарытэту старэйшых творцаў хаваецца ў юнацкім максімалізме і захопленасці пераменамі, якія прынесла рэвалюцыя. Але і сам Міхась Чарот, і некаторыя яго паплечнікі хутка расчараваліся ў «Маладняку» і далучыліся да больш «памяркоўных» суполак — «Узвышша» і «Полымя».

Міхась Чарот выявіў свой літаратурны талент і ў іншых жанрах — пісаў апавяданні, драмы, некаторыя з іх ставіліся на сцэне. Сам быў таленавітым акцёрам. Дарэчы, аповесць пісьменніка «Свінапас» стала асновай першага беларускага мастацкага фільма — «Лясная быль».

Літаратурная спадчына апошніх дзесяці гадоў жыцця Міхася Чарота невялікая. Пераважна гэта лірычныя вершы, апавяданні. Аднак многія задумкі творцы так і засталіся нязд'зейсненымі. Ён распрацоўваў «сюжэт рамана з сучаснай эпохі», пісаў паэму «Асінград», апавяданне «Горад, сачы каго». На жаль, жыццё творцы абарвалася рана і вельмі трагічна... Ён быў асуджаны НКУС як «агент польскай разведкі» і расстраляны. На сцяне камеры-адзіночкі ён выдрапаў свой апошні верш, радкі якога: «Я не чакаю, я не гадаю, бо жыў з адкрытаю душою...» гучаць пранізліва і праз восемдзесят гадоў. Міхась Чарот сапраўды і жыў, і пісаў з адкрытай насцеж душой.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**Фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва**

■ Не абмініце

# БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ

## Распачаўся Аўстрыйскі культурны сезон

**Пасольства Аўстрыі ў Беларусі адкрылася сёлета, але адразу ж дапамагло арганізаваць такі маштабны праект. Супрацоўніцтва і абмен у сферы мастацтва сцвердзіліся як важны напрамак работы Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Бернда Аляксандра БАЕРЛЯ.**

— Аўстрыйскі культурны сезон — самая вялікая мастацкая падзея ў Беларусі з удзелам аўстрыйскага боку, — сцвярджае пасол. — Сёлета наша ініцыятыва супала з Годам культуры. Цяжка адшукаць больш зручны момант для ўсталявання моцных культурных сувязяў паміж нашымі краінамі.

**Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ** зазначыў, што ідэя да ўзаемаразумення з прадстаўнікамі Аўстрыі беларусы знайшлі хутка:

— Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад», міжнародны фестываль «Беларуская музычная восень», шэраг іншых традыцыйных мерапрыемстваў, што ладзяцца напрыканцы года, — атрымліваецца своеасаблівая культурная «пераклічка» паміж Аўстрыйскім культурным сезонам і нашымі праектамі. Аўстрыйскі сезон — важкае заканчэнне Года культуры і адначасова нагода для добрага працягу супрацоўніцтва надалей. Магчыма, што праект будзе і далей рэалізоўвацца ў Беларусі.

Неабходнасць усталявання рэгулярнага культурнага дыялогу паміж нашымі краінамі цалкам падзяляе і **каардынатар мерапрыемства, праграмны дытэктар Аўстрыйскага культурнага сезона Сымон МРАЗ**, які адначасова з'яўляецца дырэктарам Аўстрыйскага культурнага форуму ў Маскве. На яго погляд, самае істотнае ў праекце — гэта магчымасць прадэманстраваць не толькі класічнае ці адно сучаснае мастацтва, але і ахапіць усе сферы культуры.

Праграма «сезона» досыць разнастайная: канцэрты, выстаўкі, тэатральныя пастаноўкі, кінапаказы, публікацыя перакладаў твораў аўстрыйскіх пісьменнікаў на старонках беларускіх літаратурных часопісаў. Афіцыйным мерапрыемствам адкрыцця Аўстрыйскага культурнага сезона стаў гала-канцэрт «Музыка Аўстрыі» на сцэне Палаца Рэспублікі.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ** ■

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, BYN | Сумма задатка, BYN | Общая площадь, $м^2$ | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1 | Капитальное строение (инв. № 100/С-33699), производственное здание, помещение на третьем этаже. Объект расположен по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 104 | 112,20 | 11,22 | 33,00 | 3,0 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств) |
| Срок договора аренды | Не менее 3-х лет | | | | | |
| Условия | 1. С победителем аукционных торгов, в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. | | | | | |
| Реквизиты для перечисления задатка | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД №100 по Брестской области, код 369, УНП 201028245 | | | | | |

**Аукцион состоится 13 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81.**
**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.**
**Последний день приема заявлений – 12 декабря 2016 г. до 16.00.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО» С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НА 60 ПРОЦЕНТОВ

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб. коп. | Задаток 20%, руб. коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Лот № 17 –** капитальное строение и прочее имущество: | | | |
| 1.1 | *Здание столовой-заготовочной* с инвентарным номером 110/С-93065, площадью 1959,6 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **344 347,44** | **68 869,49** |
| 1.2 | *Хозяйственный сарай №1* с инвентарным номером 110/С-102285, площадью 16,8 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **2 302,42** | **460,48** |
| 1.3 | *Хозяйственный сарай №2* с инвентарным номером 110/С-102300, площадью 80,2 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **6 975,70** | **1 395,14** |
| 1.4 | *Благоустройство* с инвентарным номером 110/С-102283, площадью 4692,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **58 545,89** | **11 709,18** |
| 1.5 | *Благоустройство (деревья)* с инвентарным номером 110/С-102283 | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **1 996,99** | **399,40** |
| 1.6 | *Водопроводная сеть* с инвентарным номером 110/С-102288, протяженностью 23,3 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **170,02** | **34,00** |
| 1.7 | *Канализационная сеть* с инвентарным номером 110/С-102287, протяженностью 221,2 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **601,06** | **120,21** |
| 1.8 | Передаточное устройство: *Низковольтная кабельная линия* | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **111,12** | **22,22** |
| 1.9 | *Противопожарная сигнализация* А16-512 № 29/07 АПС | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795 площадью 0,4189 га | **858,91** | **171,78** |
| | **Итого:** | | **415 909,51** | **83 181,90** |

**Аукцион состоится 12 декабря 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.**

*Организатор аукциона:* открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **06.12.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (80163): 47-75-73, 64-05-19.

---

Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (УНП 190368562 от 18.06.2002 г.) на имя МАКЕЕВОЙ Тамары Ивановны **считать недействительным.**

---

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время пребывания за границей формы 2РП, 2РН серии БА №№ 0931255, 0932568, 0932742, 1010220 **считать недействительными.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовбытсервис» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА № 2 (одноэтажное кирпичное здание с сараем), общ. пл. 115,0 кв.м, инв. № 610/С-12651,

**распложенного на земельном участке с кадастровым номером 640400000013000404 (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) площадью 0,4217 га по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Залинейная, 15.**

Склад № 2 сдается в аренду
*(сведения можно получить у организатора аукциона)*.

**Начальная цена с НДС (20%) – 64 894,94 бел. руб.** (в денежных единицах 2000 года – 648 949 400 бел. руб.) Задаток 10% от начальной цены – 6 489,00 бел. руб.

**Задаток перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **14.12.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.12.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Оргпищепром» (Продавец): производственный корпус с инв. № 640/С-84599, здание проходного пункта с инв. № 640/С-84600, асфальтное покрытие с инв. № 640/С-87556, забор сетчатый с двумя воротами с инв. № 640/С-87555, расположенные по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Заводская, 1А/1, 1А**

Часть производственного корпуса с инв. № 640/С-84599 сдается в аренду: 60,9 кв.м по 16.11.2016.

Земельный участок площадью 0,5617 га с кадастровым номером 624650100001001747. Целевое назначение – содержание и обслуживание Слуцкого производственного участка. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на охранных зонах электрических сетей ЛЭП 20 100В, площадь 0,029 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 205 016,14 бел. руб.**
**Задаток – 20 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.* Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оргпищепром», **проводимом 19 декабря 2016 г.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта: 50% в течение 5 календарных дней с момента подписания договора; 50% в течение 60 календарных дней с момента подписания договора. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **19.12.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.12.2016 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.06.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации) |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №222180206601000194, площадью 0,2471 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Домашковичи, ул. Василия Фролова, 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Домашковское), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач. цена:** 3 000/30 000 000 бел. руб. **Задаток:** 300/3 000 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №222180202601000068, площадью 0,1822 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Будачи, ул. Озёрная, участок 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (пруд №17). **Нач. цена:** 3 000/30 000 000 бел. руб. **Задаток:** 300/3 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 13.12.2016 в 14.15 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 14.11.2016 с 8.30 по 12.12.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3600317016604 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Бегомльский сельисполком). |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; осуществить гос. регистрацию права частной собственности на зем. участок в течение двух месяцев со дня получения решения и протокола о результатах аукциона; получить в установленном порядке техническую документацию на жилой дом и разрешение на его строительство в срок, не превышающий одного года; в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); снять из-под габаритов зданий на занимаемом участке плодородный слой почвы, сохранить и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; завершить строительство с сроки, определенные проектной документацией. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт.тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 452/С-5248 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – столовая), площадью 423,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, г.п. Зельва, ул. Советская, 21. Составные части и принадлежности: две пристройки, три холодные пристройки, подвал, тамбур.<br>- капитальное строение, инв. № 452/С-8004 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линейная часть электрической сети), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, г.п. Зельва, ул. Советская, 21.<br>- капитальное строение, инв. № 452/С-8003 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, г.п. Зельва, ул. Советская, 21.<br>- капитальное строение, инв. № 452/С-8002 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, г.п. Зельва, ул. Советская, 21. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422655100001001707, площадью 0.0706 га (назначение – земельный участок для размещения объектов общественного питания (обслуживания зданий и сооружений столовой)) по адресу: г.п. Зельва, ул. Советская, 21 |
| **Начальная цена продажи** | 76 360 р. (семьдесят шесть тысяч триста шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 818 р. (три тысячи восемьсот восемнадцать рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Зельвенский филиал Гроднооблпотребобщества, 231940, Гродненская область, г.п. Зельва, ул. Советская, 25, тел./факс 8-01564-245-34 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 25 ноября 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.09.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 22 ноября 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Свой погляд

# «А ЯНЫ ЎСЁ РОЎНА ПАДАЮЦЬ!»

**...Не так даўно ў нашай вёсцы зноў не было электрычнасці. Людзі, вядома ж, абураліся, адно ў аднаго і ў мяне пыталіся, чаму. Як спецыяліст у гэтай галіне, паспрабую адказаць і спасылацца буду на канкрэтныя жыццёвыя сітуацыі, якія, дарэчы, асвятляліся ў тых жа сродках масавай інфармацыі.**



Такім чынам, прыклад першы. Выпуск тэлевізійных навін, паведамленне пра нечаканы разгул стыхіі. А далей — сюжэт: у лесе, на прасецы, на абарваных правадах лініі электраперадачы (ЛЭП) ляжыць дрэва, якое іх і абарвала. Гледачы бачаць гэтую непрывабную карціну, чуюць словы рэпарцёра пра тое, што вось, маўляў, якія бываюць вятры: валяць дрэвы… І з-за гэтага зараз дзеці не змогуць рабіць урокі, іх бацькі — глядзець тэлевізар і слухаць радыё, у людзей у халадзільніках будуць псавацца прадукты…

Аднак скончыцца рэпартаж досыць аптымістычна. Гледачам скажуць, што на месца аварыі адразу ж прыбылі рамонтнікі, што яны закасалі рукавы і будуць працаваць, можна сказаць, не разгінаючыся — аж пакуль не ліквідуюць наступствы і не адновяць электразабеспячэнне.

Усё як быццам праўдзіва і правільна? Так. Але тут неабходна адно тлумачэнне. Для пракладкі ЛЭП праз лес спецыяльна робіцца прасека. Для чаго? Для таго, каб дрэвы пры іх падзенні не даставалі да правадоў. Адпаведна работнікі прадпрыемства электрасетак (ПЭС) павінны перыядычна абыходзіць гэтыя прасекі, выяўляць небяспечныя ўчасткі, рабіць неабходныя прачысткі, бо дрэвы ў тым ліку могуць расці і непасрэдна пад правадамі.

Тут, праўда, варта заўважыць, што расці яны растуць, але ж вырастаюць не за дзень, не за месяц... А значыць, на прасецы, якую паказалі па тэлебачанні, спецыялісты… нічога не рабілі як мінімум некалькі гадоў. На гэта, дарэчы, звяртаў увагу нават Прэзідэнт: пытаў, а чаму гэта небяспечныя для правадоў дрэвы не былі ў час спілаваныя?..

Яшчэ адзін прыклад: неяк у Мядзельскім раёне нашай жа Мінскай вобласці вецер паваліў 40 апор ЛЭП, і тэлебачанне людзям зноў распавяло пра капрызы надвор'я, пра максімальна кароткія тэрміны ліквідацыі наступстваў стыхіі.

Усё так і зноў жа — не зусім, бо для будаўніцтва ЛЭП распрацоўваецца адмысловы праект, дзе спецыялістамі ўлічваецца ўсё: сіла і так званая ружа вятроў, гранічныя нізкія і высокія тэмпературы той мясцовасці, снегапады, грунт і інш .; выбіраюцца апоры, правады, спосабы іх устаноўкі і ўмацавання…

У выніку гэтай вялікай работы апоры ЛЭП, будаўніцтва якіх выканана належным чынам — адпаведна праекту! — падаць не павінны.

Аднак яны чамусьці падаюць.

Між тым работнікі РЭУ Мінэнерга і раённых прадпрыемстваў электрасувязі павінны неадступна кантраляваць і якасць праекта (у тым ліку правесці яго экспертызу), і працу будаўнікоў, на мэце ў якіх часта бывае адно — як мага хутчэй скончыць работу на гэтым аб'екце, атрымаць грошы і паехаць на іншы.

Сачыць за будаўніцтвам, апроч заказчыка, павінна і праектная арганізацыя (так званы аўтарскі нагляд), бо ад гэтага напрамую залежыць яе аўтарытэт.

…Але ж трэба прызнаць, што прычынай парушэнняў электразабеспячэння з'яўляюцца не толькі так званыя разгулы стыхіі. Бываюць іншыя прычыны: удары маланкі, дарожна-транспартныя здарэнні…

У такіх выпадках найчасцей узнікае пытанне, дзе ж (канкрэтна) знаходзіцца месца пашкоджання. Здараецца, пра гэта паведамляюць жыхары, калі заўважылі нешта незвычайнае. Але ж куды часцей традыцыя час на пошукі...

А між тым гэтая праблема вырашана, прычым досыць даўно. У інжынерным цэнтры Беларусэнерганаладка яшчэ ў 1960-я гады і, дарэчы, па маім вынаходстве («Звязда» пісала пра яго 23.01.1972 г.) была распрацавана і выпускалася спецыяльная прылада для вызначэння месцаў шматфазных кароткіх замыканняў, запатэнтаваная і адзначаная медалём на ВДНГ. Адносна нескладаная, недарагая, простая ў выкарыстанні, яна прайшла праверку часам. Але ж пры гэтым узнікае пытанне: а ці на ўсіх нашых падстанцыях з паветранымі ЛЭП 6-10 кВ выкарыстоўваюцца такія або аналагічныя прылады? Мае спробы высветліць гэта плёну не далі.

Тады з'яўляецца іншае пытанне: як жа зрабіць, каб людзі не сядзелі без святла, каб час ад часу то тут, то там не парушалася электразабеспячэнне дзясяткаў, сотняў сельскіх паселішчаў? Адзін са спосабаў — у тых самых сродках масавай інфармацыі называць канкрэтныя прозвішчы і пасады вінаватых, прыцягваць іх да адміністрацыйнай адказнасці. Другі — жыхарам пацярпелых паселішчаў звяртацца ў суды па кампенсацыю як матэрыяльнай, так і маральнай шкоды. Бо беспакаранасць, як вядома, да дабра не даводзіць.

**Яўген КАВАЛЬЧУК,**
**ветэран энергетыкі, вынаходнік,**
*в. Карачуны , Дзяржынскі раён*

■

## Прававаая гасцёўня

# Каб спагнаць грошы з даўжніка,

### пацвердзіце бясспрэчнасць сваіх патрабаванняў



**На пытанні адказвае Алена МІРОШНІКАВА, галоўны спецыяліст упраўлення натарыяту і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

**Пазычыў у сябра грошы на тры месяцы. Не змог у час аддаць усю суму, закруціўся з работай, забыўся крыху. Аказалася, прайшло ўжо паўгода, сябру надакучыла чакаць, і мяне шукае судовы выканаўца. Хіба натарыус меў права рабіць выканаўчы надпіс, папярэдне не паведаміўшы пра гэта мне?**

**Аляксандр.**, *г. Слуцк.*

— Так, па-першае, натарыус меў на гэта права. Па-другое, заканадаўствам не прадугледжана апавяшчэнне натарыусам даўжніка аб здзяйсненні ў адносінах да яго выканаўчага надпісу (ні да яго здзяйснення, ні пасля).

Умовы здзяйснення натарыусам выканаўчага надпісу вызначаны артыкулам 106 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці». Адна з такіх умоў — адпаведнасць прадстаўленых дакументаў заканадаўству і пацверджанне імі бясспрэчнасці патрабаванняў спагнанніка да даўжніка (пры здзяйсненні выканаўчага надпісу аб спагнанні запазычанасці).

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2006 г. №1737 зацверджаны пералік дакументаў, паводле іх спагнанне выконваецца ў бясспрэчным парадку на падставе выканаўчых надпісаў (далей — Пералік).

Бясспрэчнасць патрабаванняў спагнанніка пацвярджаецца адпаведнымі дакументамі, вызначанымі Пералікам.

Звесткі пра даўжніка, суму запазычанасці, якую трэба спагнаць, і іншыя ўносяцца ў выканаўчы надпіс натарыусам на падставе дакументаў, якія прадставіў спагнаннік.

* * *

**Звязаўся з крэдытам у банку. Некалькі месяцаў ляжаў у бальніцы і не мог плаціць. Атрымаў здзейснены выканаўчы надпіс, згодна з якім я мушу выплаціць суму з улікам пені, якую я лічу беспадстаўна вялікай. Ці магу я аспрэчыць выканаўчы надпіс у судзе?**

**Максім Р.,**
*п. Бальшавік, Магілёўская вобл.*

— У залежнасці ад характару нязгоды з выканаўчым надпісам натарыуса даўжнік можа аспрэчыць яго праз абскарджанне здзяйснення натарыяльнага дзеяння або ў парадку іскавай вытворчасці.

Калі ёсць падстава меркаваць, што натарыус пры здзяйсненні выканаўчага надпісу дапусціў нейкія парушэнні, гэтае дзеянне можна абскардзіць.

Калі даўжнік мае нейкія пярэчанні адносна сутнасці здзейсненага выканаўчага надпісу, напрыклад па прад'яўленай спагнаннікам суме доўгу, а не ў сувязі з дапушчанымі натарыусам парушэннямі, то даўжнік мусіць звярнуцца ў суд з іскавай заявай. У гэтым выпадку адказчыкам у судзе будзе выступаць спагнаннік.

Справы ўказанай катэгорыі суды разглядаюць у парадку, прадугледжаным Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы**

■

## Добрыя навіны

# «ДОМ, АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСІХ»

***...У кожнага і сапраўды свая дарога да храма.***
***І галоўнае тады, каб гэты храм быў.***

На Рагачоўшчыне засталося толькі дзевяць старых праваслаўных цэркваў. Лёс нашай, Міхайлаўскай, можна лічыць тыповым: пабудаваў яе князь Рурык Расціслававіч ажно ў 1172 годзе. Але яна, адна з найстарэйшых у краіне, відаць, стаяла б дагэтуль, калі б бязбожнікі, прычым свае, у 20-я гады мінулага стагоддзя не скінулі званы. І калі б потым не прыйшлі «вернікі» (ужо чужыя) і ў 1943-м не разбурылі будынак: ім бярвенні спатрэбіліся для будаўніцтва моста, які, можна сказаць, нікому не паслужыў: разбамбіла яго авіяцыя пры вызваленні Лучына ад немцаў.

Так нашы вернікі засталіся без храма. Спачатку яны яшчэ трымаліся даўніх традыцый: хоць па святах ды хадзілі ці ездзілі ў царкву ў Рагачоў, а потым...

Зацягнуліся часы бязвер'я.

Але ж урэшце нашай вёсцы пашчасціла. Пашчасціла ў тым, што сюды, на радзіму, вярнуўся Уладзімір Андрэевіч Казакоў. На адным з нафтаздабываючых прадпрыемстваў Сургута ён займаў пасаду галоўнага энергетыка, выдаў кнігу аб асаблівасцях энергазабеспячэння буравых установак і паралельна — спрыяў будаўніцтву пяці праваслаўных храмаў. Не дзіва, што тут, у сваёй вёсцы, ён вырашыў пабудаваць шосты.

Шмат часу пайшло на шматлікія ўзгадненні, выбар месца, распрацоўку праекта. Сёлета, у пачатку чэрвеня, пачаліся будаўнічыя работы, а ў жніўні Найсвяцейшы Стэфан, епіскап Гомельскі і Жлобінскі здзейсніў чын асвячэння муроў з закладкай памятнай капсулы, з сумеснай малітвай, са словамі падзякі ўсім, хто прычыніўся да будаўніцтва, з уручэннем храму першага абраза — Казанскай Божай Маці.

...Сведкамі гэтай знамянальнай падзеі былі вельмі многія жыхары вёскі, многія прыезджыя, у тым ліку і маладыя. Не было толькі Уладзіміра Андрэевіча Казакова. Гэтым летам ён пайшоў з жыцця, але справу будаўніцтва паспеў перадаць у надзейныя рукі свайго сына Аляксандра.

Факт, што да Дня іконы Казанскай Божай Маці будынак нашай царквы быў амаль пад дахам. Выведзена рыштаванне для званіцы. А значыць, павінна спраўдзіцца спадзяванне Уладкі Стэфана: «Хутка мы зноў збяромся, каб асвяціць новы храм», дом, адкрыты для ўсіх у радасці і смутку.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён*

■

## Весткі з месцаў

**У Чавусах у новым навучальным годзе на базе СШ № 2 адкрыўся STEM-цэнтр**

# Робатаў будуць збіраць дзеці

**Што гэта такое? Само слова STEM — абрэвіятура з англійскіх Science, Technology, Engineering, Math, што ў перакладзе азначае — Навука, Тэхналогіі, Інжынерная справа, Матэматыка.**

І сапраўды, сёння для вырашэння пэўных праблем патрэбны намаганні некалькіх прафесіяналаў — фізікаў, матэматыкаў, інжынераў, праграмістаў... Школьная STEM-адукацыя будзе закладваць асновы таго, каб адзін і той жа чалавек быў спецыялістам ва ўсіх гэтых кірунках. Тады і рашэнні на стыку дысцыплін ён будзе прымаць самастойна.

Ініцыятарам укаранення STEM-адукацыі ў Чавускім раёне выступіла магілёўскае аб'яднанне «ЭНДО» на чале з выкладчыкам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэем Пахоменкам. Гэта ініцыятыва знайшла падтрымку з боку праекта Еўрапейскага саюза, і ў прыватнасці праграмы «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». За выдзеленыя сродкі закуплена лічбавая лабараторыя, якая дазваляе назіраць за хімічнымі, фізічнымі і біялагічнымі рэакцыямі ў рэальным часе, некалькі камплектаў робататэхнічных канструктараў, дзякуючы якім школьнікі змогуць навучыцца збіраць робатаў, праграмаваць іх работу.

STEM-цэнтр, як сказаў загадчык Чавускага раённага аддзела адукацыі Мікалай Варанцоў, не будзе замыкацца на адной школе: доступ да абсталявання адкрыты для ўсіх вучняў і настаўнікаў раёна. Для падвозкі дзяцей з іншых школ будуць задзейнічаны школьныя аўтобусы.

На першым этапе ўкаранення STEM-адукацыі падрыхтоўку настаўнікаў СШ № 2 вялі эксперты-выкладчыкі Магілёўскага дзяржуніверсітэта. Яны ж будуць дапамагаць і надалей.

Іншымі словамі, меў рацыю каардынатар праграмы «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» Ігар Шарый: дзякуючы гэтай ініцыятыве ў рэгіёнах з'явілася магчымасць належным чынам запоўніць жыццё моладзі.

Нам, жыхарам раёна, прыемна ведаць, што такіх магчымасцей для развіцця школьных ведаў няма пакуль нават у абласным цэнтры.

**Валерый Гаўрыш,** *г. Чавусы*

■

## Кватэрнае пытанне

# НА ПЕРАЕЗД ТРОХ МЕСЯЦАЎ ХОПІЦЬ?

**Мы, як маладая сям'я, мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і пабудавалі кааператыўную кватэру. Дом наш ужо здадзены ў эксплуатацыю, таму ў інтэрнаце, дзе пакуль жывём, усё настойлівей пачынаюць казаць, што пара высяляцца. Але ж пераехаць у сваю кватэру мы яшчэ не можам з-за будаўнічых дэфектаў і недаробак. Ці ёсць закон, каб выселіць нас прымусова? І ў які тэрмін?**

**С.М.,** *Мінскі раён.*

У адпаведнасці з п. 61 Палажэння аб інтэрнатах (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 05.04.2013 № 269) наймальнікі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце, члены, былыя члены іх сем'яў падлягаюць высяленню з інтэрната, у прыватнасці, у выпадку спынення альбо скасавання дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце.

Паводле п. 10.3 Тыпавога дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце (зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 05.04.2013 № 269, далей — Тыпавы дагавор найму) дагавор можа быць скасаваны, у прыватнасці, у выпадку наяўнасці (у наймальніка жылога памяшкання ў інтэрнаце) у дадзеным населеным пункце ва ўласнасці і (або) у валоданні і карыстанні па дагавору найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду жылых памяшканняў агульнай плошчай 15 кв. м і больш (у г. Мінску — 10 кв. м і больш) на аднаго чалавека, якія адпавядаюць устаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням.

У адпаведнасці з падп. 10.4 і п. 14 Тыпавога дагавора найму, у выпадку, калі наймальнік і члены яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім, з'яўляюцца членамі арганізацыі забудоўшчыкаў (у дадзеным выпадку — ЖБК), то дагавор можа быць скасаваны па заканчэнні трох месяцаў пасля здачы жылога дома ў эксплуатацыю. Пры скасаванні дагавора наймальнік і члены яго сям'і абавязаны вызваліць жылое памяшканне на працягу трох сутак (калі іншы тэрмін не вызначаны Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь або дагаворам). У выпадку адмовы наймальнік і члены яго сям'і падлягаюць высяленню з жылога памяшкання ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Наймальнікі, якія выбываюць з жылога памяшкання ў інтэрнаце, абавязаны здаць па акце аб здачы жылога памяшкання жылое памяшканне ў інтэрнаце, а таксама ўсю маёмасць, якія лічацца за імі, у належным стане. У выпадках няздачы ўказанай маёмасці альбо яе псавання, знішчэння наймальнік абавязаны пакрыць прычыненую шкоду.

Спрэчкі, якія ўзнікаюць паміж бакамі па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце, вырашаюцца ўпаўнаважанымі органамі ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй альбо ў судовым парадку.

**Віктар САВІЦКІ**

■

■ Гісторыя ў дакументах

# КАШТОЎНЫ ЛЮБЫ АРТЭФАКТ

## Як фарміравалася адна з самых цікавых сталічных выстаў

**Дапытлівасць, цікаўнасць бібліятэкараў, іх самаадданасць сваёй працы — гэтыя «тры кіты» стаяць у аснове выставы артэфактаў «Дом урада — гісторыя, дакументы, людзі», прадстаўленай у Прэзідэнцкай бібліятэцы. Гісторыя гэтай выставы ў многім незвычайная. Доўгі час экспанаты ляжалі ў слоі ўцяпляльніка на гарышчы Дома ўрада і пра іх ніхто нават і не здагадваўся. Цікава, што многа гадоў таму назад большасць з артэфактаў наўрад ці можна было аднесці да асабліва каштоўных. Але прайшлі гады, дзесяцігоддзі — і нават справаздача аб наяўнасці заработнай платы работнікам торфанарыхтоўчага прадпрыемства ўяўляецца цікавай...**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Валерый ГЕРАСІМАЎ з задавальненнем паказвае экспазіцыю.

### З чаго ўсё пачалося?

Для бібліятэкара пэўную каштоўнасць мае літаральна любы дакумент. У гэтым упэўнены **Сяргей КВАЧАН, дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі нашай краіны**. Часам пэўныя падзеі ў нейкі час адбываюцца нібыта паралельна. Але здараецца, што па волі лёсу яны перасякаюцца. Менавіта так атрымалася, калі Прэзідэнцкая бібліятэка атрымала незвычайную калекцыю дакументаў з жыцця Дома ўрада. Дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі расказаў карэспандэнту «Звязды» пра гісторыю незвычайных знаходак, якая, сапраўды, заключаецца ў «сустрэчы» двух паралельных працэсаў.

— У мінулым годзе пачаўся планавы рамонт гарышча Дома ўрада, — пачаў свой аповед Сяргей Іванавіч. — Дзейнасць нашай бібліятэкі ніяк не звязана з будаўнічымі работамі, і сам пачатак будоўлі для нас прайшоў цалкам незаўважна. Але так атрымалася, што бібліятэку наведала камісія Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Пасля працэдуры праверкі я запрасіў камісію ў свой кабінет: мяне, як кіраўніка, вельмі цікавілі вынікі — хацелася, каб члены камісіі далі нейкія рэкамендацыі, якімі б мы маглі кіравацца і надалей. Падчас размовы адзін з афіцэраў пажарнай службы згадаў пра тое, што яны, інспектары пажарнай бяспекі, падымаліся на гарышча Дома ўрада і знайшлі там фрагменты нямецкіх газет.

Сяргея Квачана гэта, безумоўна, зацікавіла. Бо была згадка пра дакументы, якія традыцыйна займаюць адно з прыярытэтных месцаў у працы бібліятэкараў.

— Для бібліятэкара каштоўнасць мае кожны дакумент, — адзначае суразмоўца. — Не важна, гэта цэлая брашура, кніга або ўсяго толькі асобная старонка, якую некалі хтосьці згубіў. Вывучаць кожны дакумент бібліятэкар можа з самых розных бакоў. Па-першае, яму цікавы змест гэтай старонкі, па-другое, хто і калі гэта надрукаваў, напісаў, колькасць копій дадзенага дакумента, лёс аўтара або ўласніка дакумента...

### Скарбы пад нагамі

Дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі разам з двума супрацоўнікамі аддзела рэдкай і старадрукаванай кнігі вырашылі наведаць гарышча Дома ўрада.

— Мы ехалі ў ліфце і ўяўлялі сабе захламленыя памяшканні, — узгадвае Сяргей Іванавіч, — са старымі сталамі, крэсламі, газетамі, звязанымі ў стосы...

Адчынілі дзверы на гарышча і — убачылі цалкам пустыя памяшканні, дзе пра хлам і размовы нават ісці не магло.

— Першае, што мы ўбачылі на гарышчы Дома ўрада за металічнымі дзвярыма, былі драўляныя бэлькі: вялікія, тоўстыя, з трывалага дрэва, змацаваныя металічнымі скобамі, — працягвае дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі. — Другое — адмысловыя свяцільні, якія выкарыстоўваюцца і ў бібліятэчных сховішчах і цалкам гарантуюць пажарную бяспеку. Трэцяе — і самае галоўнае для нас, бо менавіта там знаходзіліся ўсе дакументы, — падлога. Яна была выслана слоем уцяпляльніка — недзе на 20—30 сантыметраў. Гэта было вельмі сыпучае рэчыва цёмна-карычневага колеру. Калі рабочыя падчас рамонту пачалі яго прыбіраць, каб замяніць на больш сучасны матэрыял, ва ўцяпляльніку і былі знойдзены дакументы даваеннай пары. Відаць, з цягам часу пакінутыя некім на гарышчы паперы апускаліся ў пясок, так і атрымалася, што падстрэшша выглядала пустым. Мы дамовіліся з рабочымі, што калі яны будуць знаходзіць дакументы або іх фрагменты, то няхай пра гэта паведамляюць непасрэдна нам. З гэтага перыяду пачалася дастаткова плённая, цікавая работа па вышуку ўсіх згубленых дакументаў на гарышчы Дома ўрада.




Раней на пачках цыгарэт друкавалі нават рэкламныя слоганы.

### Усё звычайна. Калі б не даты

Разглядаем з дырэктарам Прэзідэнцкай бібліятэкі знойдзеныя дакументы. Як правіла, яны носяць характар справаздач, бухгалтарскіх каштарысаў... Усё, здавалася б, звычайна, калі б не даты на іх: сярэдзіна 20-х, 30-я, вельмі шмат дакументаў з 1941 года.

— Гэтыя дакументы знойдзены ў вельмі непрыглядным выглядзе, — звяртае ўвагу Сяргей Іванавіч. — Яны былі брудныя, скамечаныя... Спатрэбілася вялікая грунтоўная праца нашых бібліятэкараў па сістэматызацыі знойдзеных фрагментаў, па групоўцы іх у нейкія выданні — калі гэта атрымлівалася; таксама неабходна было іх адрэстаўраваць — для таго, каб паперы займелі чытальны выгляд.

Дакументы наведвальнікам выставы дазваляецца ўзяць у рукі, пагартаць, пачытаць... З гэтых папер таксама можна шмат цікавага даведацца пра тыя савецкія часы — асабліва пра перадваенны перыяд.

### Крыніцы энергіі заўсёды «ў трэндзе»

— Цікава, што і тады, і зараз актуальным было пытанне паліўнага забеспячэння краіны, — адзначае Сяргей Квачан. — У краіне ў нас няма залежаў каменнага вугалю, але ёсць торф. Па знойдзеных дакументах можна прасачыць, наколькі актуальным было гэта пытанне шмат гадоў таму.

Так, са старых, зжаўцелых аркушаў можна даведацца, якую зарплату атрымлівалі рабочыя на торфараспрацоўках.

— Гэтыя дакументы цікавыя з пункту гледжання таго, якім было матэрыяльнае становішча работнікаў, што працавалі на торфараспрацоўках у той перыяд, — каментуе дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі.

Сярод іншага можна патрымаць у руках, пачытаць «Лісток супрацоўніка Камісарыята Дзяржаўнага кантролю Беларускай ССР». Гэта орган, які зараз мае назву Камітэт Дзяржаўнага кантролю.

— Паглядзіце: гэта чалавек — беспартыйны, але ступень даверу да яго была такой высокай, што ён працаваў супрацоўнікам такой сур'ёзнай установы, — кажа Сяргей Квачан.

Яшчэ адзін дакумент Камісарыята Дзяржаўнага кантролю БССР ад 14 лютага 1940 года тычыцца будаўніцтва школы ў мястэчку Камень Лепельскага раёна. Гэта вынікі праведзенай інспекцыі. Так, камісія выявіла шэраг сур'ёзных парушэнняў — у тым ліку незаконны продаж будаўнічых матэрыялаў.

### «Строга сакрэтна»

— Звярніце ўвагу, які цікавы артэфакт, — паказвае мне суразмоўца карычневы папяровы канверт. — Надпіс «Нарком СССР. Строга сакрэтна».

На многіх дакументах указаны імёны канкрэтных людзей — супрацоўнікаў той ці іншай установы. Адразу становіцца цікава: як склаўся іх далейшы лёс? Ці перажылі яны вайну? Падобныя дакументы былі б важныя для нашчадкаў, што будуюць сваё генеалагічнае дрэва.

Цікавае можна знайсці і нечакана. Вось, напрыклад, зжаўцелая тонкая паперка — пропуск ці студэнцкі білет, незразумела. На ёй можна яшчэ расчытаць слова «пасведчанне». А таксама тое, што яно «выдана дзеля жыхарства ў м. Менску» ў 1925 годзе нейкаму студэнту, чыё прозвішча, на жаль, не захавалася. Дзіўна, як гэта папера аказалася ў будынку, які толькі пачалі будаваць у канцы 1920-х? Магчыма, яе ўладальнік уладкаваўся рабочым на будоўлю...

Ёсць цікавыя дакументы па самім сваім выглядзе — савецкія справаздачы, якія пісаліся на нямецкіх бланках, — не хапала паперы, таму выкарыстоўвалі літаральна ўсё, што было пад рукамі.

### Лісты праз гады

На гарышчы знайшлося і мноства лістоў. Два з іх асабліва цікавыя. Ліст савецкай дзяўчыны да свайго каханага, які ў 1944 годзе служыў ва ўжо вызваленым Мінску, і ліст нямецкай тэлеграфісткі, якая ў 1942 годзе працавала на сёмым паверсе Дома ўрада акупаванага фашыстамі горада.

— Ліст на нямецкай мове надрукаваны на машынцы, — паказвае ўжо пажаўцелы ад часу аркуш **Святлана ПАЎЛАВІЦКАЯ, галоўны бібліятэкар аддзела старадрука і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі**. — Яго піша дзяўчына Ханна да сваіх бацькоў і распавядае пра сябе. Ханна расказвае, што праца ў яе даволі складаная і цяжкая: яна перадае тэлеграмы, а гэта патрабуе дакладнасці, хуткасці. Далей яна паведамляе, што вечарамі ходзіць у кіно, плануе пайсці ў тэатр. Таксама яна клапоціцца пра сваю бабулю, таму што ў той павінен быць на днях дзень нараджэння, і яна просіць, каб перадалі ёй віншаванне. Адчуванне суму мы знаходзім і ў лісце савецкай дзяўчыны. Яна хвалюецца пра здароўе свайго каханага, з напісанага зразумела, што адрасат быў паранены, знаходзіўся дзесьці ў шпіталі і павінен быў адбыць на фронт. Хваляванне за лёс блізкага чалавека праходзіць праз увесь ліст... Аўтары лістоў — прадстаўнікі розных нацый, але аднаго пакалення. Што іх аб'ядноўвае — дык гэта тэма адмаўлення вайны.

### Пачкі ад цыгарэт — як экспанат

Акрамя дакументаў, ёсць і іншыя артэфакты. Многія знойдзеныя рэчы належаць яшчэ часу будаўніцтва Дома ўрада. Цвікі, нажоўка, масцяркі, спецыяльныя пояс для будаўнічага альпінізму — усім гэтым карысталіся рабочыя больш чым 85 гадоў таму.



Гэтым альпінісцкім поясам будаўнікі Дома ўрада карысталіся больш чым 85 гадоў таму.

— У архівах мы знайшлі такую лічбу: Дом урада будавалі 25 тысяч рабочых з усёй Беларусі, — расказвае **Валерый ГЕРАСІМАЎ, загадчык аддзела старадрука і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі**. — Працавалі адмыслова сфарміраваныя брыгады муляраў з Гомеля, Віцебска — з 1929-га па 1933 і нават 1934 гады. І зрабілі ўсё «на выдатна»! Будынак перажыў вайну.

Будаўнікі — самыя звычайныя людзі. Відаць, яны і ўявіць сабе не маглі тады, у пачатку 30-х, што іх рабочыя інструменты стануць экспанатамі выставы. **Юлія СЯРМЯЖКА, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Прэзідэнцкай бібліятэкі**, звярнула ўвагу, што на адным з пачкаў цыгарэт было напісана: «На культурна-сацыялістычныя патрэбы працоўных у 1933 годзе выдзелена 11 616 мільёнаў рублёў». Увогуле, рознага кшталту рэкламныя слоганы, звесткі ў савецкія часы нярэдка друкавалі менавіта на пачках цыгарэт.

### «Нівея» 70-гадовай даўніны

Асобная экспазіцыя прысвечана жыццю Дома ўрада ў гады Вялікай Айчыннай вайны падчас акупацыі. У перыяд адкрытага супрацьстаяння з Савецкім Саюзам Германія задзейнічала рэсурсы ўсёй акупаванай Еўропы. І па тых рэчах, што прадстаўлены на экспазіцыі, ты ўяўляеш: так было на самай справе. У тыя гады ўся Еўропа была супраць нас. Але мы ўсё роўна перамаглі.

У нямецкіх салдат, чые вайсковыя часці базіраваліся ў Доме ўрада, былі з сабой розныя прысмакі: шакалад, цукеркі. Можна паглядзець на бляшанкі ад кансерваў, якія везлі сюды салдаты. Ёсць сардзіны, акрамя ўласна нямецкіх, партугальскія, французскія, галандскія. На гарышчы знайшлі каля 30 відаў толькі адных кансервавых бляшанак.




Фашысты карысталіся ўсімі еўрапейскімі дабротамі, але мы ўсё роўна перамаглі.

— Ёсць шмат прадметаў побыту нямецкіх салдат, — паказвае Валерый Герасімаў. — Яны былі добра экіпіраванымі. Розныя прысыпкі, крэмы, лязо, каб галіцца... Прычым вядомых і сёння фірмаў. «Нівея», «Лакалют», кубікі «Магі» — усё гэта было ўжо тады! Канешне, тыя прамыслоўцы, рабочыя, якія выраблялі ўсе гэтыя рэчы, не вінаваты ў вайне. Можа, яны былі і супраць яе. Але тады сталі часткай вялізнага эканамічнага патэнцыялу фашысцкай Германіі.

У той час у Доме ўрада размяшчаліся другасныя штабы вайсковых часцей. Немцы не маглі тут пасадзіць сваю цэнтральную адміністрацыю, таму што будынак гэты ўзвышаўся над усім горадам. Яго савецкая авіяцыя адразу разбамбіла б.

Калі немцы адступалі ў 1944 годзе, яны замініравалі гэты будынак. Але падарваць, на шчасце, не паспелі.

* * *

Прэзідэнцкая бібліятэка — агульнадаступная, і запісацца ў яе можа любы жадаючы. Выстава «Дом урада — гісторыя, дакументы, людзі» будзе адкрыта да канца месяца, таму ёсць яшчэ магчымасць яе паглядзець.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

■ Вакол свету

# У ПОШУКАХ КАВЫ

## Чаму папулярны прадукт з цягам часу можа стаць недаступным?



**Сусветны попыт на каву імкліва расце на фоне засухі і скарачэння ўраджаю ў Бразіліі — найбуйнейшым яе вытворцы і экспарцёры. У выніку кошт ф'ючарса на «арабіку» на біржы ICE дасягнуў максімальнага значэння з лютага мінулага года — $165,5 за 37,5 фунта (каля 17 кілаграмаў). Паводле звестак Bloomberg, сусветны попыт на каву павялічыўся за апошнія 10 гадоў на 20% — прыкладна да 8,9 мільёна тон у год. Як адзначаюць эксперты, такія паказчыкі перавысілі ўсе прагнозы. Сусветны попыт на каву абагнаў аб'ём вытворчасці па тэмпах росту, паведаміла Міжнародная кававая арганізацыя (ICO). Пры гэтым такая тэндэнцыя адзначаецца ўжо другі сезон запар.**

### МОДНЫ АТРЫБУТ

Рухавік попыту — ЗША (дарэчы, найбуйнейшы спажывец у свеце), дзе прырост забяспечвае менавіта моладзь. Увогуле спажыванне кавы ў свеце расце ў першую чаргу за кошт так званых мілeніялаў — пакалення людзей, якія нарадзіліся напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х. У ЗША яны «адказваюць» за 44% попыту на каву, сведчаць звесткі даследчай кампаніі Datassential. Калі ў 2008 годзе доля тых, хто штодня ўжывае каву, сярод людзей ад 18 да 24 гадоў складала 34%, то сёлета гэты ўзровень павялічыўся да 48%. Ва ўзроставай катэгорыі ад 25 да 39 гадоў паказчык плюсануў за той жа перыяд з 51 да 60%, а сярод тых, каму за 60, — знізіўся з 76 да 64%. Змяншэнне спажывання таксама зафіксавана ва ўзроставай катэгорыі ад 40 да 59 гадоў. Адметна, што маладыя людзі пачынаюць пастаянна піць каву ў больш раннім узросце, бо гэта модны атрыбут і сімвал статусу, які спрыяе сацыялізацыі. Так, народжаныя бліжэй да 1982-га, упадабалі каву прыкладна ў 17 гадоў, а тыя, хто з'явіўся на свет пасля 1995-га, — у 14.

Маштаб спажывання насамрэч уражвае: штодня ў свеце выпіваецца больш чым 2,25 мільярда кубкаў духмянага напою. А сама кава з'яўляецца другім самым прадаваемым прадуктам спажывання ў свеце пасля нафты! Эфіопія падарыла свету гэты цудоўны напой. Мясцовы гатунак «арабіка» расце тут і цяпер у дзікім выглядзе ў гарах на вышыні 1100—2200 метраў над узроўнем мора пры сярэднегадавых тэмпературах каля 25 градусаў па Цэльсіі. Пры гэтым радзіма кавы цяпер займае пяты радок у рэйтынгу сусветных вытворцаў. У лідарах — Бразілія, В'етнам, Калумбія і Інданезія. Таксама ў першую дзясятку ўваходзяць Індыя, Мексіка, Гватэмала, Перу і Гандурас.

**Знікненне кавы акажа негатыўны ўплыў на жыццё 120 мільёнаў чалавек з больш чым 70 краін свету, занятых у вытворчасці прадукту. Дарэчы, многія з іх жывуць у самых бедных дзяржавах планеты.**

Цяпер аб'ёмы вытворчасці кавы паступова павялічваюцца, а не якасць расце пры тым, што кошт зерня застаецца параўнальна невысокім. Аднак Кітай п'е збольшага замежную каву. Пры садзейнічанні найбуйнейшай кававай кампаніі



### ПРАПАНОВА АД ПАДНЯБЕСНАЙ

Спажыванне і вытворчасць кавы закранулі такую традыцыйна чайную краіну, як Паднябесная. Кітай ужо на працягу амаль ста гадоў культывуе каву сваёй вытворчасці. Першым пачаў вырошчваць кававыя дрэвы французскі святар у правінцыі Юньнань. Аднак маштабы былі мізэрныя, — напачатку 1970-х гадоў кававыя плантацыі займалі плошчу ўсяго толькі ў 280 гектараў. Варта заўважыць, што ўмовы вырошчвання кавы ў правінцыі, уключаючы вышыню над узроўнем мора, набліжаныя да інданезійскіх і калумбійскіх. Таму Юньнань — выдатнае месца для культывавання як чайных кустоў, так і кававых дрэў. Прычым кава тут нічым не саступае па якасці ўслаўленаму юньнаньскаму чаю.

У Кітаі кава пачала набываць у 1980-х гадах усё большую папулярнасць у сувязі з правядзеннем рэформ у эканамічнай сістэме. На працягу доўгага часу Паднябесная была закрытай краінай, а змена трэнда паспрыяла распаўсюджванню напою. Развіццё кававай прамысловасці тут на працягу доўгага часу ішло параўнальна павольнымі тэмпамі.

Nestle ў 1995 годзе правінцыя Юньнань пашырыла кававыя плантацыі да 4000 гектараў, а ўжо да канца 1998-га іх плошча павялічылася роўна ўдвая. Зерне, якое збіраецца на тэрыторыі краіны, часткова экспартуецца — за межамі Кітая яно ўспрымаецца ў якасці экзотыкі, якая, акрамя ўсяго іншага, валодае насычаным смакам і багатым водарам.

Зразумела, Паднябесную нельга аднесці да ліку сур'ёзных удзельнікаў сусветнай кававай прамысловасці, аднак сваю лепту яна ўносіць, пастаўляючы ў асноўным каву гатунку, які адрозніваецца ўмераным муцкенам, высакародным водарам і чыстым, пазбаўленым староннiх прымешак смакам. Паднябесная пастаўляе каву ў Японію, Ганконг, Карэю, Тайвань, Інданезію і Сінгапур, а таксама экспартуе прадукт у Германію.

### НА ВАГУ ЗОЛАТА

Кава, як культура, можа знікнуць да 2080 года з-за глабальнага пацяплення. А да 2050-га плошча палеткаў, прыдатных для яе вырошчвання, скароціцца ўдвая. Такая сумная перспектыва вынікае са справаздачы Інстытута клімату Аўстраліі. «Плошча ўгоддзяў скароціцца з-за павышэння тэмпературы, а таксама развіцця шкоднікаў і грыбоў. А да 2080-га дзікая кава і зусім знікне», — адзначаецца ў справаздачы. Пры гэтым у сваіх даследаваннях навукоўцы не бралі пад увагу маштабную высечку дрэў у горных лясах Эфіопіі і Паўднёвага Судана, зніжэнне колькасці птушак у Афрыцы, якія распаўсюджваюць насенне кававага дрэва.

Ад 70 да 90 працэнтаў сусветных паставак кавы цяпер прыпадае на гатунак «арабіка», які дае кававе дрэва ў Аравіі (Coffea arabica). Гэта насамрэч лідар у частцы смаку і водару. Яна расце ў высакагорнай трапічнай зоне. У адрозненне ад іншых відаў кавы («ліберыка» і «рабуста») «арабіка» вельмі патрабавальная культура, яна можа існаваць толькі ў пэўных кліматычных умовах і ўмовах надвор'я, залежыць ад тэмпературы, сезоннасці і многіх іншых фактараў. Аднак навукоўцы фіксуюць, што на радзіме «арабікі» — у Эфіопіі — за апошнія 45 гадоў сярэднегадавая тэмпература паднялася на 1,3 градуса. Для далікатнай расліны гэта ўжо крытычна.

Калі пры прамысловым вырошчванні гібрыдных сартоў для кавы «арабіка» могуць ствараца неабходныя ўмовы, то ў дзікай прыродзе і ў слабых фермерскіх гаспадарках гэтага дасягнуць не ўдаецца. Вытворцы вымушаны замяняць «арабіку» больш непатрабавальнай «рабустай». На яе прыходзіцца да 20 працэнтаў сусветнай вытворчасці, але смакавыя якасці гэтага гатунку прыкметна ніжэйшыя.

Большая частка кававых плантацый Мексікі знікне да 2020 года. Далей прыйдзе чарга Нікарагуа і Танзаніі. Пад ударам акажуцца таксама Бурундзі і Эфіопія, падсумавалі навукоўцы. Знікненне кавы акажа негатыўны ўплыў на жыццё 120 мільёнаў чалавек з больш чым 70 краін свету, занятых у вытворчасці прадукту. Дарэчы, многія з іх жывуць у самых бедных дзяржавах планеты. Да канца XXI стагоддзя кава як прадукт канчаткова не знікне, але якасны напой будзе на вагу золата і стане далікатэсам для абраных, заўважаюць эксперты.

**Маштаб спажывання насамрэч уражвае: штодня ў свеце выпіваецца больш чым 2,25 мільярда кубкаў духмянага напою. А сама кава з'яўляецца другім самым прадаваемым прадуктам спажывання ў свеце пасля нафты!**

Высновы навукоўцаў справядлівыя ў выпадку, калі захаваюцца сучасныя тэмпы глабальнага пацяплення і спецыялісты не змогуць знайсці эфектыўных метадаў барацьбы са шкоднікамі і грыбковымі захворваннямі. Спецыялісты прапануюць шэраг мер, здольных хоць бы збольшага змяніць сітуацыю. Па-першае, фермерам варта шукаць новыя месцы пад плантацыі: яны павінны быць размешчаны на вялікіх вышынях або далёка ад экватара. Кававыя дрэвы даюць плады толькі праз некалькі гадоў пасля пасадкі, таму рабіць гэта неабходна ўжо цяпер. Навукоўцы прапануюць захоўваць насенне гэтых раслін у спецыялізаваных банках.



Бо дзікая кава мае набор каштоўных генетычных якасцяў, якімі не валодаюць культурныя сарты і гібрыды. Таксама навукоўцы нагадваюць пра крокі па барацьбе з глабальным пацяпленнем, якія павінны праводзіць усе краіны свету. Застаецца толькі спадзявацца, што гэтыя меры будуць мець плён.

*Захар БУРАК.*
*burak@zviazda.by*

■ Рэйтынгі

# ДЗЕ ЖЫЦЬ ДОБРА

## НАЗВАНА САМАЯ КВІТНЕЮЧАЯ КРАІНА Ў СВЕЦЕ



**У гэтым годзе самай квітнеючай краінай свету стала Новая Зеландыя. Як паведамляе выданне Business Insider, да такой высновы прыйшлі ў брытанскай арганізацыі Legatum Institute, якая штогод складае рэйтынг Prosperity Index.**

Нарвегія, якая на працягу сямі гадоў лідзіравала ў топ-лісце Legatum, апусцілася на другое месца. Яна ўступіла Новай Зеландыі па ўсіх крытэрыях, акрамя ўзроўню адукацыі, бяспекі і экалогіі. Трэцяе месца заняла Фінляндыя. Гэтую краіну прызналі найлепшай па эфектыўнасці ўлады, узроўні развіцця дэмакратыі і гарантыях вяршэнства закона. Швейцарыя, якая лідзіруе ў галіне адукацыі, заняла чацвёртае месца ў рэйтынгу росквіту. За ёй ідуць Канада, Аўстралія, Нідэрланды, Швецыя і Данія. Вялікабрытанія, якая знаходзілася год таму на 15-м месцы, палепшыла свае паказчыкі і цяпер замыкае першы дзясятак. Расія трапіла на 95-е месца рэйтынгу росквіту з адным з горшых вынікаў у галіне асабістых свабод, пад якімі ў Legatum Institute разумеюць абарону правоў і свабод грамадзян краіны, а таксама памяркоўнасць, якая праяўляецца грамадствам.

Пры складанні рэйтынгу ў Legatum Institute улічваюць 104 фактары, якія характарызуюць росквіт 149 краін. У іх лік уваходзяць не толькі валавы нацыянальны прадукт на душу насельніцтва, узровень занятасці і іншыя эканамічныя паказчыкі, але і колькасць мабільных тэлефонаў, узровень дзіцячай смяротнасці, вера грамадзян у сумленнасць выбараў і іншыя дадзеныя, якія дазваляюць меркаваць аб сітуацыі ў краіне

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 421/U-4237 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное здание хлебозавода), площадью 3290,9 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Вороново, ул. Юбилейная, 1В |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 421355100001000087 (назначение – для обслуживания хлебозавода), площадью 0,3623 га, расположенный по адресу: г.п. Вороново, ул. Юбилейная, 1В |
| **Начальная цена продажи** | 250 018 р. (двести пятьдесят тысяч восемнадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 12 500 р. (двенадцать тысяч пятьсот рублей) |
| **Продавец** | Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г.п. Вороново, ул. Калинина, 4, 8-01594-217-83 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | 100% предоплата |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещается участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 22 ноября 2016 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-4112 (назначение – здание нежилое, наименование – контрольно-производственная лаборатория), площадью 149,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28, корп. 1 с оборудованием: распределительный ящик ЩРНМ-5 (1000х650х300)IP31, рубильник РПЦ-1 (2 шт.) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000002008456 (назначение – земельный участок для обслуживания здания контрольно-производственной лаборатории), площадью 0,0336, расположенный по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28/1. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код – 13,5 площадью 0,0051 га |
| **Начальная цена продажи** | 149 003,20 р. (сто сорок девять тысяч три рубля двадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 450 р. (семь тысяч четыреста пятьдесят рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, 28, тел. 72-30-50, факс 72-00-67 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 ноября 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.07.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 22 ноября 2016 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

